Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вярочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. На 3 — 2 р. 70 к. На 6 — 4 р. — к. На 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапіраі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапіраі пасьлядо тэксту 1 р. — к. За радок шапіраі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьменныя ка 50 проц. дарожэй. Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 коп. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддаленнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. аддзелах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАЧЫНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 51 (2540) Аўторак, 5-га сакавіка 1929 г.

Прывітаньне генштабу сусьветнай рэвалюцыі

АД НЯМЕЦКІХ КАМУНІСТАЎ.

Нямецкія камуністы пасылаюць палкае камуністычнае прывітаньне Камуністычнаму Інтэрнацыяналу ў дзень яго 10-е гадавіны. Дзесяць гадоў Камінтэрну, гэтадзесяць гадоў нястомнае, няўхільнае, самаахвярнае барацьбы міжнароднае рабочае класы проці сусьветнага капіталу, проці здрадніцтва і сацыял-імпэрыялізму міжнароднае сацыял-дэмакратыі. Засканавы найвялікшым рэвалюцыянэрам нашага часу, кіраўніком бальшавіцкае партыі Леніным, Камуністычны Інтэрнацыянал абярнуўся ў сусьветную партыю пралетарскае рэвалюцыі.

Заснаваны ў агні першае імпэрыялістычнае сусьветнае вайны і умацаваны і загартаваны ў бурах пасьляваенных рэвалюцыйных боек, Камуністычны Інтэрнацыянал узбройвае атрады камуністычных барацьбітоў і мілёньныя пралетарскія масы і вядзе іх у бойку проці імпэрыялістычнае вайны, у бойку, якая ў моц свайго сусьветнага гістарычнага значэньня зьявіцца экзаменам для камуністаў усіх краёў. З прычыны пагрозы нападу імпэрыялістычных армій на Савецкі Саюз, які зьяўляецца адзінаю бацькаўшчынаю сусьветнае рабочае клясы, перад намі стаіць задача абярнуць імпэрыялістычную вайну ў грамадзянскую, падрыхтаваць пераход салдат буржуазных армій на бок Чырвонае арміі, падрыхтаваць скасаваньне капіталістычнага панаваньня і заснаваньня пралетарскае дыктатуры.

У дзесятую гадавіну свайго існаваньня Камуністычны Інтэрнацыянал злучае свае шэрагі і пільна ахоўвае чыстату сваёй бальшавіцкай лініі проці ўсіх замахаў на яе з боку дробнабуржуазных і нестойкіх элемэнтаў. Разьбіўшы трацкісцкую контррэвалюцыю, Камуністычны Інтэрнацыянал накіраваў свой агонь у першую чаргу на абарону пастаноў VI сусьветнага кангрэсу, проці адкрытае апартуністычнае правае небяспекі і проці беспрынцыповага прымірэнцтва. Выразная рэвалюцыйная пазіцыя пераважнае большасьці партыйных мас УсеКП(б) і нямецкае кампартыі сьведчыць аб тым, што Камуністычны Інтэрнацыянал здольны адбіць усялякую спробу перагляду пастаноў VI сусьветнага кангрэсу з боку правых і прымірэнцаў з тым-жа посьпехам і з тою-ж сілаю, з якімі ён разьбіў трацкізм.

Да дзесяцігодзьдзя Камуністычнага Інтэрнацыяналу наш лёзунг нажа:

НАПЕРАД, НА БАРАЦЬБУ ПРОЦІ СУСЬВЕТНАГА КАПІТАЛУ!

НАПЕРАД, ДА ПРАЛЕТАРСКАЕ РЭВАЛЮЦЫІ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКІ КАМІНТЭРН!

НЯХАЙ ЖЫВЕ АВАНГАРД КАМІНТЭРНУ —СТАЛЁВАЯ УсеКП(б)!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ПЕРАМОГА КАМУНІЗМУ!

Па даручэньні ЦК нямецкае кампарты **ТЭЛЬМАН.**

Самі сабе выкапалі магілу.

КРАХ ПА ЎСІХ ВУЧАСТКАХ ЗАМЕЖНАЕ ПАЛІТЫКІ АНГЕЛЬСКІХ КАНСЭРВАТАРАЎ.

ЛЁНДАН, 2-3. Рэакцыйная «Дэйлі Мэйль» зьявіла на бачным месцы артыкул лёрда Ротэрміра, які знаходзіцца зараз у Злучаных Штатах Ротэрмір перасьцерагае ўрад Бальдвіна ад «рэальнае і сур'ёзнае небяспекі», якая пагражае Англіі ў зьвязку з пагаршаньнем англа-амэрыканскіх дачыненьняў.

«Пытаньні ангельскае замежнае палітыкі,—піша Ротэрмір,—будуць адыгрываць вялічэзную ролю ў надыходзячых ўсеагульных выбарах. Нажаль, гэтыя выбары выявяць, што палітыка кансэрватыўнага ўраду заслугоўвае ганьбы». Ротэрмір прапануе ўраду Бальдвіна выразна перад адстаўкаю заявіць ураду Злучаных Штатаў аб сваім жаданьні абмеркаваць пытаньні ня толькі аб прыбліжных разьмерах марскога флёту, але і ўсе пытаньні аб блёкадзе і кантрабандзе.

«Права абвяшчаць блёкаду,—піша далей Ротэрмір,—у сучасны момант становіцца пагрозаю для самае Англіі, бо гэтае права дае магчымасьць чужаземнай марской дзяржаве пазбавіць Англію харчоў, бо Англія прывозіць 80 проц. усяго патрэбнага харчу праз мора".

Надзвычайна вялікае зьмяншэньне ліку галасоў, нададзеных ва кансэрватыўных кандыдатаў на апошніх дадатковых выбарах, на думку Ротэрміра, не павінна дзівіць. Ротэрмір падкрэсьлівае, што ён заўсёды заяваў, што пагроза паглыбленьня супярэчнасьцяў між Англіяй і Злучанымі Штатамі зробіць толькі адмоўны ўплыў на ход парляманцкіх выбараў. Кансэрватыўны ўрад павінен чакаць далейшага зьмяншэньня галасоў, калі ён распачне перавыбарчую кампанію, пакідаючы ўзаемадачыненьні між Англіяй і Амэрыкаю ў незадавальняючым стане.

У БАРДО АДНАВІЛАСЯ СТАЧКА.

ПАРЫЖ, 2-3. Агэнцтва Гаваса паведамляе, што бастуючыя докеры ў Бардо аднавілі забастоўку.

Як вядома, 2 тысячы докераў у Бардо абвясьцілі забастоўку пратэсту проці арышту 2-х дэлегатаў. Дэлегаты былі арыштаваны за тое, што зьвярнуліся да прадпрыёмцаў з патрабаваньнем звольніць сваіх майстроў, несяброў прафсаюзаў і, пасьля адмовы прадпрыёмцаў выканаць гэтае патрабаваньне, заклікалі докераў да забастоўкі.

Забаставаўшыя докеры і рабочыя мэталёпрамысловых прадпрыёмстваў Бардо ўчора наладзілі ня астрогу шматтысячную дэманстрацыю, патрабуючы вызваленьня арыштаваных і ўсеагульнае палітычнае амністыі. Дэманстранты прайшлі на панадворак астрогу, дзе між імі і паліцыяй здарылася вострая стычка.

КРЫЗІС ПАГЛЫБЛЯЕЦЦА.

НЯМЕЦКІМ МЕНШАВІКАМ НЕ ЎДАЛАСЯ МІСІЯ ПРЫМІРЭНЬНЯ БУРЖУАЗНЫХ ПАРТЫЙ.

БЭРЛІН, 2-3. Перамовы аб афармаваньні сучаснае ўрадавае кааліцыі ў Нямеччыне канчаткова нацярпелі няўдачу. Учора рэйхсканцлер Мюльер склікаў нараду лідэраў партыі кааліцыі, на якой прапанаваў праэкт згоды між гэтымі партыямі. Водлуг праэкту, партыі павінны абавязацца падтрымліваць сучасны ўрад. Партыя цэнтру згадзілася ўзяць на сябе якія-небудзь абавязацельствы толькі пасьля ўхвалы яе прапаноў наконт бюджэту і падатковых пытаньняў.

Пасьля нарады рэйхсканцлер Мюльер заявіў, што спроба афармаваньня кааліцыі не ўдалася, і што новых такіх спроб ня будзе.

Водлуг слоў газэт, няўдача перамоў ня выкліча адстаўкі ўраду. Ва ўсякім разе сучасны габінэт будзе праводзіць бюджэт праз рэйхстаг.

БАРАЦЬБА ЗА ЎЛАДУ Ў АЎГАНІСТАНЕ.

АМАНУЛА—АДЗІНЫ СУР'ЁЗНЫ ПРЭТЭНДЭНТ.

ЛЁНДАН, 2-3. Пэшаварскі карэспандэнт афіцыёзу міністэрства замежных спраў «Дэйлі Тэлеграф» паведамляе, што раней-ны джалалабадзкі губернатар Алі Ахмэд-хан, які знаходзіцца зараз у Пэшавары, заявіў, што будзе змагацца на карысьць Амануллы, калі будзе мець належную падтрымку грашыма і людзьмі.

Карэспандэнт выказвае такую думку: «Калі Аўганістан ізноў будзе мець цэнтральны ўрад, дык Амануллы будзе спатканы мыхарствам больш ахвотна і прыхільна, чымся хто-небудзь з тых, хто зараз пасягае на каралеўскі трон у Аўганістане». Карэспандэнт лічыць вэўным, што частка аўганскіх пляменьняў настроена на карысьць Амануллы. Карыстаючыся падтрыманьнем афрыдаў, а таксама шынвары, Аманула, як відаць, будзе мець магчымасьць ізноў сабраць армію, захапіць Кабул і адчапіць сваю каралеўскую ўладу.

УСЕ АУГАНСКІЯ МІСІІ САЛІДАРНЫ З АМАНУЛАЮ.

БЭРЛІН, 1-3. Наконт чутак, што Хабібула аддаў загад распусьціць сучасныя аўганскія дыпляматычныя місіі заграніцаю аўганская місія ў Бэрліне заяўляе, што яна ня мае ніякіх вестак пра такі загад, а калі-б ён і быў сапраўды выдадзен, дык аўганскія дыпляматычныя місіі не зварочалі-б на яго ніякае ўвагі, бо яны ні ў якой меры ня зьвязаны з Хабібулаю.

Як заяўляе далей місія, аўганскія дыпляматычныя прадстаўніцы заграніцаю прызнаюць уладу Амануллы.

* * *

БЭРЛІН, 1-3. Аўганская місія ў Бэрліне заяўляе, што аўганскія пасланьнікі ў Турцыі і ў СССР, якія лічацца выдатнымі вайсковымі спэцыялістамі, думаюць выехаць у Кандагар, каб дапамагчы Амануле пры яго ваенных апэрацыях проці Хабібулы, а аўганскі пасланьнік у Лёндане ўжо выехаў у Кандагар.

ТАВ. ДАБРАДЖЭЯНУ ГАЛАДУЕ 6-ТЫ ТЫДЗЕНЬ.

Анры Барбюс патрабуе вызваліць пакутніка.

МАСКВА, 2-3. Анры Барбюс паслаў румынскаму прэм'ер міністру Маніу такую тэлеграму: «Рэвалюцыянэр Дабраджэяну-Гэрэа, засуджаны ваенным судом на 8 гадоў астрогу, абавясьціў галадоўку у знак пратэсту проці прысуду і галадуе ўжо 6-ты тыдзень. Я патрабую ад імя перадавое інтэлігенцыі Захаду і ў імя цывілізацыі чалавечнасьці неадкладна вызваліць яго».

АДКАЗ ЛАТВІІ НА САВЕЦКУЮ НОТУ ПРАТЭСТУ.

РЫГА, 2-3. Латвійскае міністэрства замежных спраў прислала адказ на савецкую ноту пратэсту проці кампаніі латвійскага друку, накіраванага проці паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Латвіі. У латвійскай ноце заявачаецца, што міністэрства замежных спраў зусім не салідарызуецца з нападкамі латвійскага друку на паўнамоцнае прадстаўніцтва і, згодна яго патрабаваньня, пракуратура ўжо узьняла справу проці „Латвінгс Саргс" за антысавецкі артыкул.

У БЭРЛІНЕ ВЫКРЫТА ФАБРЫКА АНТЫСАВЕЦКІХ ФАЛЬШЫВАК.

Арыштаваныя белагвардзейцы прызналіся, што ІМІ БЫЛІ СФАБРЫКАВАНЫ „ЛІСТ ЗІНОЎЕВА", „ДАКУМАНТ" АБ ВЫБУХУ САБОРУ Ў САФІІ, „ДАКУМАНТЫ" ПРОЦІ СЭНАТАРА БОРА І ІНШ.

Падробшчыкі злоўлены на месцы злачынства.

БЭРЛІН. У Бэрліне выкрыта майстэрня антысавецкіх фальшывак, у якой былі змайстраваны падробленыя дакументы, накіраваныя ў Злучаныя Штаты. Фальсіфікатары—расейскія белагвардзейцы—прапанавалі купіць фальшывыя дакументы аб нікчэмнаўным подкупе сэнатара Бора. Арыштавана некалькі ўдзельнікаў падробкі.

Водлуг вестак карэспандэнта, гэтыя арышты сьведчаць аб шырока разгалінёнай арганізацыі па вырабе антысавецкіх фальшывак, а іменна: «дакумантаў» Бора, вядомага «лісту Зіноўева», «дакумантаў» аб выбуху сабору ў Сафіі ў 1927 г. і інш. У друку зьявіліся шмат-якія дэталі аб працы падробшчыкаў і тэкстуальна прыводзіцца зьмест фальшывак.

Арыштаваны ранейшы сьледчы царскае аховы, стацкі саветнік Арлоў, сын ранейшага сэнатара Сумарокава, барон Дыхтэр і прынцэса Сумарокава Гертруда Дымлер. Арлоў і Сумарокаў поўнасьцю ўжо прызналі свае ўчынкі і, між іншым, сазналіся, што яны **СФАБРЫКАВАЛІ ТАК ЗВАНЫ «ЛІСТ ЗІНОЎЕВА» І ліст наконт выбуху сабору ў Сафіі.** Фабрыка фальшывак была добра абсталяваным прадпрыёмствам, якое давала шмат прыбыткаў і дало магчымасьць Арлову, (стаўшаму на чале прадпрыёмства) набыць вілу і маёнтак у Макленбурзе. Арлоў і Сумарокаў, як галоўныя абвінавачаныя, засталіся пад вартаю. На кватэры Арлова знойдзены 3 скрынкі з матар'ялам для працы па падробках. Між іншым, знойдзены камплекты каўчуковых і мэтальёвых пячатак, бляшкі савецкіх устаноў, ДПУ, Камінтэрну, абсталяваньне хімічнае лябараторыі, а таксама зброя. Выкрыта таксама і картатэка, абхватам больш 500 картак з фатаграфіямі і дакладнымі жыцьцёпісамі вядомых дзеячоў СССР і Камінтэрну, а таксама камуністычных лідэраў розных краёў.

З прызнаньня Арлова і Сумарокава відаць, між іншым, што ў іх майстэрні зроблены ўсе 15 дакумантаў, пры дапамозе якіх была наладжана палітычная кампанія проці амэрыканскіх сэнатараў Бора і Борыса. Выкрыць майстэрню фальшывак удалося дзякуючы таму, што Сумарокаў прапанаваў бэрлінскаму карэспандэнту «Нью-Ёрк Іўнінг Пост» Нікербокеру купіць некалькі падробленых дакумантаў, выдаваючы іх за сапраўдныя. Нікербокер паведаміў аб гэтым паліцыі і для формы распачаў з Самарокавым перамовы. Сумарокаў быў узяты бэрлінскай паліцыяй пад нагляд.

Такім парадкам удалося выкрыць яго сувязь з іншымі фальсіфікатарамі. Дзеля спробы Сумарокаў перадаў Нікербокеру 3 фальшывых дакументы ДПУ. У першым з іх, зробленым на бляшку ДПУ, паведамляецца, што супольна з Камітэрнам ДПУ распаўсюдзіла фальшывыя дакументы, якія дыскрэдытуюць сэнатара Бора, каб шляхам выкрыцьця фальшывасьці гэтых дакумантаў замаскаваць нібыта меўшы месца подкуп Бора. Другі дакумант таксама зроблен на бляшку ДПУ, памечан студзенем 1926 году і падае шэраг інструкцый наконт захадаў, неабходных для абароны інтарэсаў Бора. Гэты дакумант часткова зашыфраваны, прычым ключ шыфру павінен быў быць прададзены асобна. Трэцяя фальшыўка за подпісам аднаго з сяброў АДПУ пацьвярджае сапраўднасьць прысланых з Парыжу матар'ялаў.

Апроч падбору дакумантаў, банда Арлова абвінавачваецца яшчэ і ва ўзломе, які яна ўчыніла сёлета ў студзені з самага пачатку перамоў сваіх з Нікербокерам у яго бюро; мета ўзлому пакуль-што яшчэ не ўстаноўлена.

Арлоў кіраваў у свой час бэрлінскім цэнтрам шпіянажу Дзянікіна і Ўрангеля.

Фашысцкі ўрад Польшчы крывадушнічае.

Маскоўскі пратакол для пілсудчыны—фіранка, за якою мілітарысты спрабуюць пашырыць падрыхтоўку да нападу на СССР.

Не зважаючы на існаваньне пратаколу...

ВЕНА, 2-3. З Бухарэсту паведамляюць, што румынскі міністр замежных спраў Міранэску, які вярнуўся з падарожжа ў Варшаву, зрабіў у радзе міністраў даклад аб выніках сваіх перамоў у Варшаве. Бухарэсцкі карэспандэнт аўстрыйскага тэлеграфнага агэнцтва паведамляе: «У Варшаве намераны, не зважаючы на існаваньне маскоўскага пратаколу, ня толькі пакінуць бяз зьмен, але яшчэ і пашырыць польска-румынскую ваенную канвэнцыю».

ПАТРАБАВАНЬНІ Ў СЭНАЦЕ ЎПАРАДКАВАЦЬ АДНОСІНЫ З СССР.

ВАРШАВА, 2-III. Учора на пасяджэньні камісіі сэнату па замежных справах цягнуліся спрэчкі аб замежнай палітыцы Польшчы.

Сэнатар беспартыйнага блёку супрацоўніцтва з урадам Раговіч, спыняючыся на савецка-польскіх дачыненьнях, зазначыў, што адсутнасьць гандлёвых зносін з СССР адмоўна ўплывае на эканамічны стан Польшчы.

Выступіўшы пасьля Раговіча сэнатар нацыянал-дэмакратычнае партыі Казіцкі таксама адзначыў, што трэба пашырыць гандаль з СССР. На яго думку, пашырэньне эканамічных зносін з СССР будзе, аднак, магчымым толькі пасьля таго, як Польшча ўпарадкуе свае палітычныя дачыненьні с Савецкім Саюзам.

«Калі да гэтага часу,—зазначыў Казіцкі, — няма ніякіх палітычных умоў, якія спрыялі-б разьвіцьцю эканамічных зносін з СССР, калі мы да гэтага часу яшчэ ня маем гандлёвага ўгавору з гэтым краем, дык гэта зьяўляецца толькі вынікам палітычнае ідэалёгіі у вядомай частцы палітычных колаў нашага краю. З гэтае прычыны належыць прарэвізаваць погляды на польскую палітыку ў адносінах да СССР».

Парэпце Казіцкі запытаў міністра замежных спраў Залескага, ці думае ўрад упарадкаваць узаемадачыненьні з СССР і падпісаць з ім пагоджаючы угавор і гандлёвую згоду.

У адказе прамоўцам Залескі заявіў, што польскі ўрад згодзен у любы момант падпісаць з СССР пагоджаючы ўгавор. Што-ж датычыць гандлёвага ўгавору, дык аб ім яшчэ няма канкрэтных перамоў, бо міводзін з бакоў ня думаў яшчэ пра канкрэтныя прапановы ў гэтым пытаньні.

СПРЭЧКІ Ў СОЙМЕ АБ МАСКОЎСКІМ ПРАТАКОЛЕ.

КАМФРАКЦЫЯ ВЫКРЫЛА ДВУРУШНІЦТВА ЎРАДУ.

ВАРШАВА, 2-III. Учора на пленарным пасяджэньні сойму разглядаўся ў першым чытаньні ўрадавы законапраэкт аб ратыфікацыі маскоўскага пратаколу. У спрэчках вялікую прамову сказаў камуністычны дэпутат Сіпула. Ён зазначыў, што буржуазныя дзяржавы карыстаюцца кожным выпадкам, каб падануць масы сваёю мірнаю балбатнёю, і адначасна з гэтым узбройваюцца, рыхтуючыся да вайны проці першае пралетарскае дзяржавы, якою зьяўляецца СССР. Калі Літвінаў у Жэневе прапанаваў усім дзяржавам разброіцца, дык гэта прапанова была адхілена ўсімі дзяржавамі. Калі-ж Літвінаў прапанаваў Польшчы падпісаць мірны пратакол, дык Польшча выкарыстала гэта, каб заснаваць пры ўдзеле Эстоніі і Латвіі антысавецкі блёк. Польская буржуазея падманывае польскія рабочыя масы, бо падпісваючы пратакол, яна адначасна рыхтуецца да вайны. З гэтае прычыны Сіпула прапанаваў адхіліць праэкт аб ратыфікацыі маскоўскага пратаколу. Сойм адхіліў прапанову Сіпулы і перадаў законапраэкт у камісію па замежных справах.

ПОЛЬШЧА РЫХТУЕЦЦА АДНАВІЦЬ ПЕРАМОВЫ З СССР?

ВАРШАВА, 2-3. У зьвязку з выступленьнем сэнатараў Раговіча і Казіцкага ў камісіі сэнату па замежных справах аб савецка-польскіх гандлёвых дачыненьнях, у польскіх палітычных колах надаюць вялікае значэньне паведамленьню органу нацыянал-дэмакратаў «Газэта Варшаўска» аб гэтым пытаньні. Газэта сёньня паведамляе, што польскі ўрад рыхтуецца да перамоў з СССР аб падпісаньні гандлёвага ўгавору. Водлуг слоў газэты, адпаведныя міністэрствы ўжо сабралі патрэбныя для перамоў матар'ялы.

„Адзінага" Кітаю ня існуе.

Выкрыта змова проці нанкінскага ўраду.

КРЫВАВАЕ РАЗБРОЕНЬНЕ ПЭЙПІНСКАГА ГАРНІЗОНУ.

ПЭЙПІН, 2-3. Сёньня, згодна загаду Ен-Сі-Шана, шаноўскае войска разброіла 2-хтысячны атрад, які знаходзіцца ў раёне Пэйхай (паўночна-заходняя частка Пэйпіну). Пры разброеньні здарылася стычка, у якой 35 салдат паранена і 2 забіта.

Згодна заявы пэйпінскае ўлады разброеньне часьці было вымушана тым, што камандзір часьці генэрал Чан-Іін-Фан, які знаходзіцца ў сучасны момант у Цынцьзіне, як устаноўлена, праводзіў перамовы з Чжан-Цзуо-Чанам і ўдзельнічаў у змове проці нацыянальнага ўраду.

Цынцьзінскі друк паведамляе аб арышце і пакараньні сьмерцю генэрала Чан-Хун-Сюна, які раней таксама быў у складзе арміі Чжан-Цзуо-Чана. Пакараны ўдзельнічаў у змове проці нацыянальнага ўраду, Змоўшчыкі мяркавалі выкінаць 28-га лютага ваенныя непарадкі ў Цынцьзіне і Пэйпіне адначасна.

ПАХОД ПРОЦІ СТУДЭНЦКАГА РУХУ.

ШАНХАЙ, 2-III. Каб паралізаваць палітычную дзейнасьць студэнцкіх арганізацый, нацыянальны ўрад выдаў загад з прапановаю студэнтам вярнуцца да заняткаў і адмовіцца ад усялякае крытыкі ўчынкаў мясцовае ўлады і прадстаўнікоў ураду.

Франка-бэльгійскі ўгавор--падробка?

ЗАЯВА ФРАНЦУСКАГА ВАЙСКОВАГА МІНІСТЭРСТВА.

ПАРЫЖ, 2-III. Агэнцтва Гаваса паведамляе: «Вайсковае міністэрства заяўляе, што тэкст т. зв. англа-бэльгійскага пратаколу нарады прадстаўнікоў французскага і бэльгійскага генэральных штабаў зьяўляецца грубаю падробкаю. Водлуг вестак брусэльскае газэты «Насіён Бэльж», аўтарам нікчэмнаючага франка-бэльгійскага ўгавору зьяўляецца нямецкі шпіён, якому было загадана дастаць тэкст ваеннае згоды за ўзнагароду ў 100 тысяч марак. Пасьля бескарысных спроб шпіён надумаў сфабрыкаваць падробку, каб падануць сваіх заказчыкаў. Водлуг паведамленьняў брусэльскіх газэт, арыштаваны Гэйнэ прызнаўся, што ён сфабрыкаваў ад пачатку да канца дакумант, агалошаны «Утрэхт Тагеблят», выкарыстаўшы для гэтага ўгавор, утвораны перад вайною дзьвюма дзяржавамі, але ня Бэльгіяй і не Галяндыяй».

ПАХОД ПРОЦІ ШВЭЙЦАРСКАЕ КАМПАРТЫІ.

БЭРЛІН, 2-3. Як паведамляюць з Бэрну (сталіца Швэйцарыі), швэйцарскі ўрад забараніў антыфашысцкую дэманстрацыю, якая наладжваецца швэйцарскай кампартыяй у вялікодныя дні ў Тэсіне. Транспартным таварыствам прапанавана адмовіцца давать ароднкі на праезд для ажыцьцяўленьня дэманстрацыі. Удзельнікі дэманстрацыі павінны быць затрыманы для выяўленьня, хто яны такія. Чужаземцы, удзельныя ў дэманстрацыі, падлягаюць арышту і высылцы.

Урад забараніў таксама насіць форму чырвонага саюзу франтавікоў на тэрыторыі Швэйцарыі.

Зговар проці нацменшасьцяў.

ВЕНА, 2-III. З Бухарэсту паведамляюць, што між Грэцыяй, Румыніяй і Югаславіяй дасягнута згода аб адзінай пазіцыі на надыходзячай сэсіі рады Лігі Нацый у пытаньні аб нацыянальных меншасьцях.

На думку гэтых дзяржаў, сучасная ахова нацыянальных меншасьцяў здавальняе іх, і ніякіх новых мерапрыёмстваў непатрэбна.

СУПРОЦЬ ФАШЫСЦКАГА ТЭРОРУ.

Сябры ячэйкі МОПР'у пры Аршанскім АВК катэгарычна пратэстуюць супроць белага тэрору і нацыянальна-сацыяльнага прыгнечаньня шырокіх працоўных мас Заходняй Беларусі, супроць натаржнага прыоуду над кіраўнікамі Грамады.

Польскаму фашызму турмамі і тэрорам ня ўдасца задушыць рабочых і сялян Зах. Беларусі, якія змагаюцца за сваю свабоду.

Патрабуем вызваленьня грамадзяўцаў і наогул усіх палітзьняволеных барацьбітоў за пралетарскую справу.

Патрабуем вольнай дзейнасьці для разьвіцьця культурных і палітычных арганізацый шырокіх працоўных мас Заходняй Беларусі.

* * *

Калектывы працаўнікоў II-й і IX Барысаўскіх аўтрэйонах школ пратэстуюць супроць зьдзекаў польскіх паноў над працоўнымі Заходняй Беларусі.

Мы пратэстуем супроць зруйнаваньня беларускіх школ, забароны выкладаньня на роднай мове; патрабуем вызваленьня дзеячоў Грамады і палітзьняволеных польскіх турмаў.

Ганьба Луцкевічам і Астроўскім, якія прадалі за „чечевичную похлебку" інтарэсы працоўных Беларусі!

* * *

Агульны сход членаў саюзу будаўнікоў г. Воршы заяўляе:

Польскі фашызм імкнецца вынішчыць усе перашкоды, якія стаяць на яго шляху ў падрыхтоўцы да ўзброенага нападу на Савецкую Беларусь і СССР.

— Мы заяўляем польскаму фашызму, што рэвалюцыйны рух тэрорам і катаржнымі прысудамі яму не задушыць; наадварот, гэта яшчэ больш запалвае рэвалюцыйны імпэт працоўных усяго сьвету.

Мы патрабуем вызваленьня ўсіх палітзьняволеных.

У Саюзе ССР.

Патрэбна рашучая чыстка апарату.

НЯШЧАДНЫ АДПОР СПРОБАМ ФРАКЦЫЙНАГА АФАРМЛЕНЬНЯ ПРАВАГА ЎХІЛУ Ў ПАРТЫІ.

На маскоўскай губпартканфэрэнцыі.

МАСКВА, 4-3. 3-га сакавіка 17-я маскоўская губэрская партыйная канфэрэнцыя заслухала даклад тав. Карасьцялёва аб працы маскоўскае кантрольнае камісіі. У 1927 годзе за розныя ўчынкі на працягу 11-ці месяцаў было прыцягнута да адказнасьці 7.010 партыйцаў, г. зн. больш 5-ці проц. усяго маскоўскае арганізацыі. З гэтага ліку выключана 24 проц. і апраўдана 15 проц. У 1928 годзе малюнак крыху зьменьваецца: кантрольныя органы прыцягнулі да адказнасьці блізка 10 т. партыйцаў, г. зн. прыблізна 6,5 пр. усяе арганізацыі; з гэтага ліку выключана блізка 37-мі проц. Такім парадкам, мы бачым большую суровасьць і вымаганьні кантрольных органаў у адносінах да прыцягнутых партыйцаў. Галоўным парадкам выключаліся асобы, зьвязаныя з чужым элемэнтам, асобы, якія абраслі гаспадарча і выкарыстоўвалі партыю дзеля сваіх асабістых мэтаў. П'яньства выклікае за сабою няўхільна і шэраг іншых злачынстваў.

Заключную частку свайго дакладу т. Карасьцялёў прысьвечае пытаньню аб барацьбе з запаскуджанасьцю савецкага апарату. У дзяржфінадзеле абсьледаваньне выявіла шмат старых чыноўнікаў, ранейшых белых афіцэраў, кваран, пракурораў і інш. Ня дзіва, што з ліку дэталяваных недоімак у 38 мілёнаў рублёў на прыватным сэктары 24 мілёны давялося зусім сьпісаць. Такая-ж вабрудненасьць апарату была ўстаноўлена ў аппараце «МОЗО», дзе з 295-ці праверэных супрацоўнікаў было толькі 20 партыйцаў і 12 рабочых, а белых афіцэраў—аж 12.

У спрэчках па дакладзе тав. Карасьцялёва выступаўшыя таварышы падавалі шмат прыкладаў, якія сьведчаць аб неабходнасьці рашучае чысткі дзяржаўнага апарату.

У рэзалюцыі па дакладзе МКК адзначана, што МКК правільна праводзіла палітычную лінію ў барацьбе з трацкіскай апазыцыяй, выкавала вялікую працу ў галіне чысткі арганізацыі ад непраўных элемэнтаў, якія парвалі сувязь з партыяй і г. д. Поруч з дасягненьні МКК да кастрычніцкага пленуму МК і МКК дапусьціла палітычную памылку ў пытаньнях барацьбы з правым ухілам і примірэнцтвам, не заваўшы выразнага палітычнага напрамку, недадаваўшы небяспекі і на ўжыўшы своечасова захадаў, каб выправіць памылкі ў кіраўніцтве маскоўскае арганізацыі і ў галіне паваротаньня сроб фракцыйнае барацьбы проці ЦК. МКК павінна даваць рашучы адпор спробам фракцыйнага афармленьня правага ўхілу, не дапускаючы парушэньня бальшавіцкае дысцыпліны ў партыйнай арганізацыі.

КАМСАМОЛ У ПЕРАДАВЫХ ШЭРАГАХ ОЗЕТ'у.

МАСКВА. ЦК УсеЛКСМ заслухаў даклад КАМЗЕТ'у і ОЗЕТ'у. Ва ўхваленай па дакладзе пастанове ЦК УсеЛКСМ прапанаў ўсім мясцовым арганізацыям і камітэтам заснаваць больш шчыльную сувязь з мясцовымі органамі КАМЗЕТ'у і ОЗЕТ'у, даваць ім пастаянную дапамогу, абавязаць усе камсамольскія арганізацыі ў дадзены 6 бліжэйшых 6 ці месяцаў правесьці масавую кампанію за растлумачэньне пытаньняў вёрэйскага землеўпарадкаваньня, за шырокае ўцягваньне ў ОЗЕТ рабочае, у асобнасьці, вёрэйскае моладзі.

Апроч таго, ухвалена прапанаваць дэлегацыі УсеЛКСМ у выкананьне Камінтэрну Моладзі ўжыць усе захады да папулярызацыі дасягненьняў савецкае ўлады ў галіне земляўпарадкаваньня вёрэйскіх працоўных сярод вёрэйскіх рабочых Эўропы і Амэрыкі, ЦБ, якіх пінэрэў—ужыць захады да заснаваньня дзіцячых груп прыцялёў ОЗЕТ'у.

Бюро ЦК зварочае ўвагу ЦК ЛКСМУ, ЦК ЛКСМБ, крымскага абласнога камітэту ЛКСМ і Далёкаўсходняга крайкому на патрэбу пашырыць культурнае абслугоўваньне вёрэйскае сялянскае моладзі.

Міха Цхакая—старшыня ЦВК Грузіі.

ТЫФЛІС, 1-3. Адбылася сэсія ЦВК Грузіі. Пра дзейнасьць прэзыдыуму зрабіў даклад тав. Махарадзе. Старшынёю СНГ Грузіі абран старшыня ЦВК Грузіі Махарадзе з вызваленьнем яго ад пэўнер займаемай пасады.

Старшынёю ЦВК Грузіі абраны Міха Цхакая.

Буйныя выйгрышы па 10 тыражу пазыкі 1926 г.

МАСКВА. 1-га сакавіка ў політэхнічным музеі адбыўся дзесяты тыраж пазыкі 1926 г. Выйгрышы ў 25 тысяч рублёў прыпалі на серыю 1.844 аблігацыі 50, серыю 3.922 аблігацыі 2, серыю 2.143 аб. 20.

Выйгрыш у 100 тысяч рублёў належыць серыі 2.052, аблігацыі 48.

Пачаўся 7-мы зьезд працаўнікоў асьветы.

МАСКВА. Першага сакавіка адчыніўся 7-мы ўсесаюзны зьезд працаўнікоў асьветы. Ад імя ЦК УсеКП(б) і ўраду зьезд прывітаў т. Калінін, які даў у 2-хгадзінным дакладзе падрабязны агляд міжнароднага і ўнутранага становішча СССР. Зьезд насылае прывітаньне ЦК УсеКП(б) і ўраду, а таксама Н. К. Крупскай да 60-х угодак з дня яе нараджэньня.

Водны транспарт на 7-мігадзінны дзень.

МАСКВА, 1-3. У НК Шляхоў адбылася міжведамсьцьвенная нарада аб пераходзе на 7-мігадзінны працоўны дзень майстэрняў воднага транспарту.

Нарада прызнала патрэбным з 1-га верасьня пераводзіць на 7-мігадзінны працоўны дзень майстэрні Архангельскага порту, кіўскія майстэрні водных шляхоў і астраханскія майстэрні Волскага суднаходства.

Тэмп машынабудаўніцтва расьце.

ЛЕНІНГРАД. Адчынілася першая ўсесаюзная канфэрэнцыя рабочых мэталёўцаў пры Гіпрамэце. Сябра калегіі Галоўмашынбуду Аборын зробіў даклад аб пяцігадовым плане машынабудаўніцтва. Уся машынабудаўнічая прамысловасьць будзе перабудавана ў аснове. 2.118 мілёнаў рублёў будзе ўкладзена ў машынабудаўніцтва. Прадукцыя заводаў павялічыцца за пяцігодку в 1.365 мілёнаў да 3.428 мілёнаў рублёў.

Выганім непрацоўны элемэнт з камунальных будынкаў.

МАСКВА. СНК РСФСР перадаў на зацьверджаньне прэзыдыуму ўсерасейскага ЦВК законапраэкт, водлуг якога асобы непрацоўных катэгорый, прыбытак якіх перавышае 3 тысячы рублёў у год, павінны быць выселены ў адміністрацыйным парадку без падаваньня жыльлёвае плошчы з муніцыпальных будынкаў.

Звальненьне вучняў з Віл. Бел. Гімназіі.

*„Кур'ер Віл

Бязьлітасна ўдарыць па зрыўшчыках працоўнае дысцыпліны.

ПРАГУЛЬШЧЫКАМ, ЗАДЗІРАМ І П'ЯНІЦАМ НЯ МЕСЦА Ў НАШЫХ ПРАЛЕТАРСКІХ ШЭРАГАХ.

Адозва УЦСПС да ўсіх рабочых і работніц.

МАСКВА, 2-III. УЦСПС у адозве да ўсіх рабочых і работніц зазначае, што маслабленьне працоўнае дысцыпліны ў апошні час стварыла пагрозу зрыву гаспадарчага пляну, павялічваючы тым самым і цяжкасьці сёлетняга году.

8-мы Ўсесаюзны зьезд прафэсыянальных саюзаў у сваіх пастановах заклікаў рабочыя масы да «сьвядомага і цьвёрдага выкананьня сваіх абавязкаў у вытворчасьці». Задачы, высунутыя 8-м зьездам прафсаюзаў, павінны рашуча праводзіцца ў жыцьцё. Рашучая барацьба павінна быць абвешчана ўсяму таму, што ўчыняе нязьлічоную шкоду сацыялістычнай гаспадарцы і дэзарганізуе вытворчасьць. Фармальныя, неахайныя адносіны да вытворчых абавязкаў, безгаспадарчасьць, і грубыя, пагардныя адносіны да рабочых з боку некаторых прадстаўнікоў інжынэрна-тэхнічнага персаналу, кумаўство і патэкцыянізм—усё гэта павінна быць рашуча зьнішчана ў заводзкім жыцьці. Прагульшчыкі і парушыцелі працоўнае дысцыпліны павінны адчуваць сабе маральна асуджанымі ў таварыскім асяродку на прадпрыёмстве. Патрэбна палепшыць адносіны між інжынэрна-тэхнічным персаналам і рабочымі па прапрыёмстве. Бяручы ўдзел у правядзеньні і ў кантролі над дзейнасьцю адміністрацыі праз свае грамадзкія заводзкія арганізацыі, кожны рабочы, разам з тым, абавязан у часе працы за варстатам дакладна выконваць загад адміністрацыі.

УЦСПС заклікае ўсю рабочую клясу ўзмацніць сваю самадзейнасьць, актыўнасьць і дзелавую самакрытыку, накіраваўшы яе на зьнішчэньне ўсіх перашкод, якія прыпыняюць уздым прадукцыйнасьці працы і НА ЎСТАНАЎЛЕНЬНЕ ЗДАРОВАЕ ПРАЦОЎНАЕ ДЫСЦЫПЛІНЫ. Рабочая кляса павінна даць рашучы адпор, як элемэнтам, якія прыносяць у вытворчасьць задзірыстыя адносіны да народнае сацыялістычнае гаспадаркі, так і элемэнтам, якія сеюць перапуд і баяцца цяжкасьцяў, зьвязаных з перыядам сацыялістычнае перабудовы нашае гаспадаркі.

ДА МІЖНАРОДНАГА КАМУНІСТЫЧНАГА ЖАНОЧАГА ДНЮ.

(Артыкул тав. Клары Цэткін).

Вайна вайне! Усе на абарону СССР! Гэтыя асноўныя лёзунгі на гэты раз жкрава гораць на сьцягу ва ўсіх краінах пры выступленьнях у жаночы дзень. Гэта—чырвоны сьцяг Камуністычнага Інтэрнацыяналу. Вакол гэтых двух асноўных лёзунгаў групуюцца патрабаваньні, якія высоўваюцца эксплёатуемымі і прыгнечанымі ў капіталістычных краінах, у краінах калёніяльных і паўкалёніяльных, у барацьбе з катамі, групуюцца асобныя патрабаваньні, якія заклікаць вымягчыць цяжкія пакуты працоўных жанчын.

Падобна двум асноўным лёзунгам гэтыя патрабаваньні цьвёрда дыктуюцца моментам. Трэба мабілізаваць самыя шырокія масы працоўных жанчын і мужчын на барацьбу з заядлым ворагам. Стабілізаваны сусьветны капіталізм скарыстае часова ўмоцненую ім уладу ў сваіх уласных інтарэсах, ён імкнецца абярнуць увесь сьвет у вялізарны апарат капіталістычнага прыбытку, разьмяняць на золата чалавечую годнасьць эксплёатуемых. Толькі працоўныя могуць даць адпор яго імкненьням і з карэньнем вырваць яго з жыцьця. Сіла супроць сілы! У процівагу сіле сусьветнага капіталізму імпэрыялістычных дзяржаў — магутнасьць сусьветнага пралетарыяту, які змагаецца за сваё вызваленьне. Міжнародны Камуністычны Жаночы Дзень вярбуе масы і асабліва жаночыя масы—на барацьбу за сусьветную рэвалюцыю. Пралетарская дзяржава, якая горда вышла з нетраў Чырвонага Кастрычніка, выканала патрабаваньні работніц і сялянак, жанчын вольных прафэсій і ўсіх працоўных жанчын, тыя патрабаньні, за якія прыходзіцца яшчэ ўпарта змагацца на Захадзе і на Ўсходзе. Для жанчын у СССР 8 сакавіка—дзень прысягі—выконваць і надалей свой рэвалюцыйны абавязак. Дзяржава пралетарскае дыктатуры ўзьняла жанчын СССР на ступень вольных і раўнапраўных. Яна шырока ажыцьцяўляе заканадаўчую ахову жаночай працы, ахову маткі і дзіцяці, у інтарэсах узьняцьця народнай асьветы і народнай культуры. І працоўныя жанчыны СССР павінны актыўна ажыцьцяўляць сваё права вольных і раўнапраўных, працуючы самаахвярна і з натхненьнем над справаю ажыцьцяўленьня сацыялізму, здольнага напоўніць жывым поўнакаштоўным зьместам іх свабоду і раўнапраўе.

Пралетаркі і сялянкі, працоўныя жанчыны СССР! Вашы сёстры ў капіталістычных краінах і ў калёніяльных вобласьцях глядзяць на вас, як на гэроеў рэвалюцыйнай барацьбы, стварыўшых савецкую дзяржаву і здолеўшых пераможна абараніць яе ад усіх надворных і ўнутраных ворагаў. Яны глядзяць на вас, як на гэроеў працы, бязупынна і адважна нясучых і пасоўваючых сацыялістычнае будаўніцтва, ня гледзячы на ўсе цяжкасьці, не баючыся ніякіх небясьпек.

Далейшае разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва—наймацнейшая непераможная апора СССР для адбіваньня нападаў, задуманых імпэрыялістычнымі ворагамі. Развіцьцё культурнай рэвалюцыі пралетарскай дзяржавы замацоўвае справу палітычнай і эканамічнай рэвалюцыі, але гэта культурная рэвалюцыя павінна быць справаю і жанчын. Калісьці 8 сакавіка было тэю трывогаю, якая заклікала на рэвалюцыю супроць царызму і вайны. На гэты раз 8 сакавіка заклікае працоўныя жаночыя масы дзяржавы пралетарскае дыктатуры на справу культурнай рэвалюцыі, якая абярнула СССР у наймацнейшую апору сусьветнай рэвалюцыі. Непарушная воля працоўных СССР да сацыялістычнага будаўніцтва і баявая адвага эксплёатуемых і прыгнечаных у краінах, дзе пануе і расьцягвае народную маемасьць капіталізм, магутна злучаюцца ў адно. Міжнародны Камуністычны Жаночы Дзень вярбуе на рэвалюцыйны адзіны фронт барацьбы з сусьветным капіталізмам, пад кіраўніцтвам камуністычных партый, Камуністычнага Інтэрнацыяналу масы барацьбітоў бяз розьніцы роду, нацыянальнасьці, расы, вызнаньня. Ён вярбуе масы барацьбітоў на вайну супроць вайны, у абарону і ахову СССР. З запалам баявое рашучасьці таварышы ў капіталістычных і калёніяльных краінах пасылаюць 8 сакавіка сваё гарачае прывітаньне будуючым сацыялізм сёстрам і братом у СССР і клянуцца ім у вернасьці. Наперад-жа поплеч насустрач сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі! Няхай жыве камунізм!

IV Усебеларускі зьезд інспэктароў народнай асьветы

Стан і чарговыя задачы народнай асьветы ў сувязі з культурнай рэвалюцыяй.

(З дакладу Народнага Камісара Асьветы БССР тав. Баліцкага.)

Усю нашу працу па народнай асьвеце мы вядзём зараз пад сьцягам культурнай рэвалюцыі. Камунізм немагчым бяз высокага стану культуры. Дзеля таго, каб з большым посьпехам будаваць сацыялістычны лад, нам неабходна падняць на значную ступень культуры ўзровень усяго працоўнага насельніцтва і ў першую чаргу рабочых і бяднейшых сялян. Таму задачы народнай асьветы мы павінны ставіць так, каб яны цалкам адпавядалі задачам культурнай рэвалюцыі.

У эпоху капіталізму пралетарыят ня мог культурна выхоўвацца, цывілізавацца, ня мог узьнімаць свой культурны ўзровень. Толькі ўзяўшы ўладу ў свае рукі, ён змог паставіць ва ўсю шырыню праблему культурнага росту працоўных мас і ў першую чаргу—пралетарыяту.

СПАДЧЫНУ БУРЖУАЗНАЙ КУЛЬТУРЫ МЫ ПАВІННЫ ПЕРАПРАЦАВАЦЬ.

Ад буржуазеі мы атрымалі ў спадчыну культурныя помнікі і стагодзьдзямі накопленыя веды. Гэтыя веды мы павінны перапрацоўваць пад пунктам погляду пралетарскай ідэалёгіі. Разам з матар'яльнай культурай, прыемлемай для нас, мы атрымалі і духоўную культуру, ідэалёгічную спадчыну, якая зараз надзвычайна шкодзіць у нашым жыцьці. Гэта старая ідэалёгія яшчэ жыве ў нашай грамадзе, у адсталай частцы рабочай клясы і сярод сялянства. Зьнішчэньне гэтай старой ідэалёгіі, зьнішчэньне старых звычак, старога быту—наша чарговая задача, асабліва важная ў эпоху культурнай рэвалюцыі.

МЫ ПАВІННЫ ПЕРАТВАРЫЦЬ ПРЫРОДУ І ПСЫХІКУ МАС.

Мы павінны ня толькі перарабіць стары матар'яльны сьвет і на грунце падпраўкаванага прыроды атрымаць новыя матар'яльныя і культурныя каштоўнасьці,—нам неабходна ператварыць прыроду і псыхіку мас, навучыць масы інакш думаць, інакш працаваць, прывіць ім звычкі новага быту. Ператварэньне прыроды і псыхікі мас і зьяўляецца вялізарнай задачай усёй нашай асьветнай сыстэмы, у першую чаргу—нашай школы. Задача нашай школы—ня толькі з няпісьменнага чалавека зрабіць пісьменнага, але і ператварыць яго звычкі, зрабіць яго культурным чалавекам у нашым сэнсе.

Мы павінны зжыць неахайнасьць, забабоны, знахарства. Мы павінны выпрацаваць у чалавека веру ў сацыялістычную грамаду, выпрацаваць імкненьне да змаганьня з някультурнасьцю, са ўсімі адмоўнымі зьявамі ў нашым побыце. Мы павінны выкаваць энтузіязм да барацьбы за новы лад, за новую, сацыялістычную грамадзкасьць, за будаўніцтва сацыялістычнай гаспадаркі і культуры. Наш ідэал—калектыў, але ў калектыў, у гэту шарэнгу, якая бадзёра шагае па шляху да сацыялізму, чалавек павінен ісьці сьвядома, ведаючы—куды ён ідзе. Выхаваньне такога культурнага чалавека і зьяўляецца першачарговай задачай нашай школы.

УЦЯГНЕНЬНЕ МАС У БУДАЎНІЦТВА ПРАЛЕТАРСКАЙ КУЛЬТУРЫ—НАША ЗАДАЧА.

Наша культура ствараецца масамі, тварцом яе зьяўляецца большасьць [illegible] сельніцтва. Стагодзьдзямі накопленая энэргія зараз абуджаецца, стварае новыя каштоўнасьці, з нетраў працоўнага насельніцтва высоўваюцца таленты.

Мы бачым, як дыялектычны матэрыялізм завабўвае сабе няўхільную пазіцыю ва ўсіх галінах навукі. Педагогіка таксама перапрацоўваецца зарав пад знакам дыялектычнага матэрыялізму. Будаўніцтва гэтай пралетарскай культуры масамі ўсяго працоўнага насельніцтва, пачынаючы ад школы і канчаючы навукова-дасьледчымі ўстановамі і зьяўляецца нашай задачай у эпоху культурнай рэвалюцыі.

БОЛЬШ УВАГІ МАСАВАЙ АСЬВЕТНАЙ ПРАЦЫ.

Культурная рэвалюцыя прадбачыць пашырэньне ўсіх відаў асьветнай працы і ў першую чаргу масава-асьветнай працы. Да такіх відаў асьветнай працы належыць наша школа-чатырохгодка, палітасьветная праца ў хатах-чытальнях, клюбах, нардамох, кіно, радыё і г. д. На мясцох не заўсёды ўважліва адносяцца да масавых формаў палітасьветнай працы. Хата-чытальня часта бывае пад замком, у хаце-чытальні нельга ўсядзець ад холаду, няма належнай літаратуры. Гэтай масавай форме культасьветнай працы наша інспэктура ў большасьці аддае менш увагі, чымся школьнай. Трэба гэту масавую палітасьветную працу наладзіць так, каб яна не стаяла ніжэй за школьную.

ПРАБЛЕМА „КУЛЬТУРНЫХ НОЖНІЦ".

Перад намі стаіць праблема «культурных ножніц» паміж горадам і вёскай. Гэтыя «культурныя ножніцы» даюць сябе адчуваць ва ўсіх галінах нашага культурнага жыцьця. Калі мы возьмем агульную пісьменнасьць, дык у горадзе мы маем 692 чалавекі пісьменных, а ў вёсцы—372 на тысячу насельніцтва; нагрузка на аднаго настаўніка ў чатырохгадовай школе ў гарадох 37 вучняў, у раёне—47; адзін вучань у горадзе абыходзіцца ў год 28 руб., у вёсцы—18 руб.; у горадзе чатырохгадовай школай ахоплена 92 проц. дзяцей школьнага ўзросту, у вёсцы—68 проц. Такім чынам, як бачыце, мы маем значныя культурныя ножніцы паміж горадам і вёскай. Ажыцьцяўленьне нашага пяцігадовага пляну павінна ісьці пад знакам сьцісканьня гэтых ножніц. Праўда, гэтая справа цяжкая, і горад згуртаваны разам, будзе яшчэ на працягу цэлага шэрагу гадоў стаяць вышэй за вёску, але прынамсі выраўніваньне, сьцісканьне гэтых ножніц мы павінны рабіць. Наш пяцігадовы плян у сваім разьвіцьці і прадбачыць сьцісканьне гэтых культурных ножніц.

ВЯСКОВАЯ ШКОЛА—БЛІЖЭЙ ДА ЖЫЦЬЦЯ.

Нашы чатырохгадовыя школы ня зусім добра пастаўлены ў праграмных адносінах. Нашы праграмы і падручнікі неабходна будзе перагледзець у бок большага ўзмацненьня ў іх сельска-гаспадарчых ведаў, бо мы павінны выхоўваць у нашых школах людзей, якія імкніліся-б падняць і перабудаваць сельскую гаспадарку. Наша школа павінна даць элемэнтарныя сельска-гаспадарчыя веды, прывіць вучням пэўныя агрыкультурныя звычкі.

Актуальнай нашай задачай зараз зьяўляецца згортваньне вакол школы савецкай грамадзкасьці. Гэта значна паспрыяе палепшаньню і выхаваўчай справы ў школе, дапаможа зьнішчэньню розных хібаў і адмоўнасьцяў у выхаваньні, як антысэмітызм, шавінізм і імшыя.

Кажучы аб выхаваўчай справе, мы, [illegible] разе не павінны забывацца і пра навучальную. Задачы навучаньня мы ні ў якім разе не павінны паслабляць. Грош цана будзе нашай школе, калі яна будзе выпускаць напісьменных людзей. Таму, побач з выхаваньнем, мы павінны ўзмацняць і фармальныя веды.

САЦЫЯЛЬНЫ АДБОР Ў ШКОЛЕ.

У нашы школы мы павінны прымаць дзяцей беднаты і серадняковай у вёсцы і рабочых у горадзе ў першую чаргу. Разумеецца, у зьвязку з агульным абавязковым навучаньнем, наша чатырохгадовая школа павінна ахапіць дзяцей школьнага ўзросту ўсіх сацыяльных груп, але калі ў нас пакуль што школ не хапае, дык мы павінны пры ўкамплектаваньні нават чатырохгадовых школ трымацца прынцыпу сацыяльнага адбору. А ў далейшым, пры пашырэньні школьнай сеткі, наша школа будзе абслугоўваць усё насельніцтва, бо мы павінны перавыхоўваць новае пакаленьне, незалежна ад таго, з якой сацыяльнай групы гэта пакаленьне паходзіць.

Побач з гэтым мы павінны зьвярнуць увагу на пытаньне аб замацаваньні бядняцкіх вучняў у школе, каб яны не адсейваліся з нашых школ. Фонд дапамогі бядняцкім вучням у гэтым годзе павялічан з 50 да 142 тысяч рублёў. Але гэтага мала, мы павінны прыцягнуць у фонд беднаты грамадзкія сродкі, а таксама сачыць, каб фонд дапамогі беднаце скарыстоўваўся па прызначэньню. Апрача матар'яльнай дапамогі бядняцкім вучням, трэба наладзіць і пэўную педагагічна-навучальную сыстэму, пры якой батрацка-бядняцкая дзетвара не адставала-б. Трэба паставіць пытаньне шырокай прапаганды за пасылку ў школу дзяцей беднаты і батракоў.

Асаблівую ўвагу мы павінны аддаць сацыяльнаму адбору пры камплектаваньні другога канцэнтру сямігодкі. Беднаты, зволенай ад с.-г. падатку, у нас лічыцца 35 проц., а вучняў-беднякоў у другім канцэнтры сямігодак—усяго 16 проц. Гэта лічба бязумоўна нездавальняючая, і мы павінны ў далейшым гэты процант павялічыць.

Аднак, сацыяльны склад нашых сямігодак мы павінны паляпшаць праз набор, а ня спосабам звальненьняў тых, каго мы ўжо прынялі і хто ўжо вучыцца. Ніякай чысткі ў сямігодках мы не павінны рабіць, ніякіх бясспрычынных звальненьняў. Зусім іншая рэч тэхнікумы і вышэйшыя навуч. установы.

Тут мы безагаворачна звальняем тых, хто захаваў сваё сацыяльнае паходжаньне.

МАСАВЫЯ ПЕРАКІДКІ І ПЕРАВОДЫ.

Кожны год у нас бывае куча скаргаў на масавыя перакідкі і пераводы настаўніцтва. Бязумоўна, гэта справа ненармальная. Такія зьявішчы не павінны мець месца, да пераводаў трэба падыходзіць з вялікай асьцярогай, улічваючы матар'яльнае становішча нашага настаўніка, бо пераезды з месца на месца перш за ўсё б'юць яго па кішэні. Да пераводаў трэба прыбягаць толькі ў крайніх выпадках.

Таксама ўлічваючы матар'яльнае становішча настаўніцтва трэба імкнуцца да таго, каб даваць месца мужу і жонцы разам. Праўда, тут ёсьць некаторыя адмоўнасьці ў гэтай справе, бывае, што замест двух настаўнікаў працуе адзін. Па такіх выпадках мы павінны біць і біць моцна, але з гэтага не вынікае, што мужа і жонку трэба рассаджываць па розных школах, калі магчыма даць месца разам.

ДА РЭВІЗІІ ТРЭБА ПАДЫХОДЗІЦЬ КУЛЬТУРНА.

У справе рэвізаваньня нашых асьветных установ мы павінны ўжываць культурныя мэтады. У нас заўважалася раней такая справа: калі ні прыедзе інспэктар у школу, дык апрача нахвальбы больш нічога ня відаць, ён толькі хваліць. А там ёсьць шмат адмоўных зьявішчаў, яны накапляюцца, сьпеюць і ствараюць запраўдныя гнойнікі. Пачытайце старонку асьветніка ў «Савецкай Беларусі», яе дадатак „Працаўнік Асьветы", або „Зьвязду", і вы ўбачыце, як стаіць справа з гэтага боку ў некаторых нашых школах. Чым гэта тлумачыцца? А тым, што мы слаба вядзём працу папяраджаньня гэтакіх зьявішчаў. Зараз мы павінны весьці нашу кіруючую працу так, каб бачыць гэтыя адмоўныя зьявішчы, бачыць як толькі яны пачынаюцца. Такім дарам павінен уладаць кожны інспэктар.

Часта бывае, што пры рэвізіях уцягваюць малых дзяцей. Гэта непедагагічна і зусім недапусьціма. Часта ўцягваюць дзяцей у склокі паміж настаўнікамі, апрашваюць цэлую клясу аб тым, што рабіў настаўнік, аб чым ён гаварыў і г. д. Мне здаецца, што тут, апрача падрыву аўтарытэту настаўніка, больш нічога ня можа быць, тым больш, што на паказаньні 8-гадовых малышоў нельга палажыцца. Іншая справа ў старэйшым канцэнтры сямігодкі. Тут трэба арганізаваць грамадзкую думку дзяцей праз грамадзкія вучнёўскія арганізацыі.

НАСТАЎНІЦТВА ТРЭБА ПЕРАВЫХАВАЦЬ У НАПРАМКУ КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЫ.

Зараз культурная рэвалюцыя і масавыя віды працы набываюць вялізарнае значэньне, і справа ўцягненьня настаўніцтва ва ўсе галіны масавай працы зьяўляецца надзвычайна важнай задачай нашых органаў асьветы. Наша настаўніцтва трэба ўцягнуць ва ўсе грамадзкія падзеі, якія адбываюцца на вёсцы. Гэта—задача нашай інспэктуры і саюзу працасьветы, якія павінны перавыхаваць наша настаўніцтва ў напрамку клясавай барацьбы.

Трэба паставіць пытаньне аб пашырэньні кніжкі і газэты праз настаўніцтва і вучняў. Праўда, настаўнік працуе ў гэтым напрамку, але гэту працу трэба ўзмацніць. Трэба шырока разгарнуць працу за ўзьняцьце ўраджайнасьці.

АБ ПРАЦЫ САМОЙ ІНСПЭКТУРЫ.

Наша інспэктура складаецца яшчэ з маладых кадраў. Раней у нас былі загадчыкі культаддзелаў, а зараз ужо год, як мы арганізавалі ў раёнах інспэктуру нарасьветы. Гэтым мы імкнуліся палепшыць кіраўніцтва асьветай, падабраць лепшых прапаўнікоў у раёнах. У значнай частцы мы гэтага дасягнулі. Але ўмовы працы інспэктара мала зьмяніліся, раённы інспэктар, апрача сваіх прамых абавязкаў, выконвае цэлы шэраг іншых. Часта бывае так, што райінспэктар ня можа нават затлянуць у свае школы. Гэта ненармальна. Нам трэба ўзмацніць кампанію за разгрузку інспэктара ад іншых абавязкаў. Разумеецца, інспэктар не павінен быць пазбаўленым ад грамадзкай працы ў раёне. Зараз праходзіць цэлы шэраг кампаній, на якія партыя і савецкая ўлада мабілізуюць увесь актыў, у тым ліку і інспэктуру.

Мы павінны падняць усё настаўніцтва і ўсіх культпрацаўнікоў на барацьбу за культуру. Мы павінны згуртаваць усю грамадзкасьць, мабілізаваць яе думку вакол пытаньняў культурнай рэвалюцыі. Партыя і савецкая ўлада пэўны, што мы гэту задачу вырашым, і мы яе павінны вырашыць.

Спрэчкі па дакладу тав. Баліцкага.

У спрэчках па дакладу тав. Баліцкага прымала ўдзел амаль палова ўсіх делегатаў зьезду. Выступаўшыя спыняліся пераважна на пытаньнях практычнай працы на мясцох. Адзначаліся такія зьявішчы, як цякучасьць настаўніцкага складу, што значна ўскладняе справу ўкамплектаваньня школ настаўнікамі перад пачаткам навучальнага году.

Значна шкодзіць працы па ўцягненьню беднаты ў школы спазьненьне з выдачай вызначаных на дапамогу беднаце сродкаў.

Амаль што ўсе выступаўшыя скардзіліся на вялікую перагрузку інспэктароў працай па райвыканкомаўскіх справах, што не дае магчымасьці інспэктару аддаць належную ўвагу асьветнай справе ў раёне.

Закраналіся праграмы нашых школ, адзначалася іхная няўвязка, асабліва па пытаньнях інтэрнацыянальнага і антырэлігійнага выхаваньня.

Зьезд з прыемнасьцю слухаў зазначэньні аб культурным уздыме вёскі, аб імкненьні сялянства да чырвонага кутка, да кнігі. Але нашы бюджэтныя магчымасьці значна адстаюць ад культурных запатрабаваньняў вёскі. Прыходзіцца гуртаваць грамадзкасьць вакол справы матар'яльнай дапамогі культурным пачынаньням. Не абмінулі і пытаньня агранамізацыі школы, кінуўшы заслужаны папрок Наркамзему і Наркамасьветы, якія мала клапаціліся аб тым, каб дапамагчы настаўніцтву ў гэтай важнай справе. Зазначалі на непадрыхтаванасьць настаўніцтва да працы па ўздыму сельскай гаспадаркі і наогул на нянрыгоднасьць часткі настаўніцтва да культасьветнай справы ў умовах культурнай рэвалюцыі. Некаторыя нават да гэтага часу не пазбавіліся рэлігійнасьці, ня цікавяцца газэтай.

Наогул спрэчкі выявілі багаты вопыт нашай хоць яшчэ і маладой інспэктуры ў пытаньнях як навучальна-выхаваўчай справы ў школе, так і ў галіне масавага грамадзка-палітычнага абуджэньня вёскі. Гэта значна дапаможа Наркамасьветы ў справе лепшага прыстасаваньня да жыцьця як нашых школ, так і масавых грамадзка-выхаваўчых установаў.

Узмацнім рабочае шэфства.

Сваю адзінаццатую гадавіну Чырвоная армія спаткала ў абставінах узрослай ваеннай небясьпекі. Кожны новы дзень лішні раз пацьвярджае правільнасьць указаньняў VI кангрэсу Камінтэрну на тое, што ваенная небясьпека зьяўляецца «галоўнаю восьсю сучаснага міжнароднага становішча».

Савецкі Саюз увесь час знаходзіцца пад пагрозай нападу з боку імпэрыялістычных дзяржаў. Весь пагэтаму ўзмацненьне Чырвонай арміі і абароназдольнасьці краіны павінна стаць неаслабнай турботай нашага ўраду і працоўных.

Чырвоная армія ўступае ў 12 год свайго існаваньня ўзмоцненай, непераможнай апорай дыктатуры пралетарыяту. Баявая падрыхтоўка, палітычная сьвядомасьць чырвонаармейскіх часьцей, цьвёрдасьць кіраўніцтва паркарганізацый, згуртаванасьць і падрыхтаванасьць начальніцкага складу—даюць права сказаць аб баявой і палітычнай гатоўнасьці Чырвонай арміі грудзьдзю сустрэць узброенага ворага. Няўхільна ўзрастаючая індустрыялізацыя краіны і буйнейшыя посьпехі партыі і савецкай улады ў сацыялістычным будаўніцтве падводзяць пад баявую і палітычную загартаванасьць Чырвонай арміі тэхнічную аснову, павялічваюць яе сілы.

Важнейшая задача зараз—клясавае згуртаваць усіх чырвонаармейцаў пад лёзунгамі партыі так, каб з іх вышлі актыўныя барацьбіты за сацыялістычнае будаўніцтва ў горадзе і вёсцы. Гэтага асабліва патрабуе абвастрэньне клясавай барацьбы ў краіне. Гэта задача павінна быць вырашана пры ўдзеле рабочых фабрык і заводаў, пры бязупынным і неаслабным уплыве пралетарскіх арганізацый на чырвонаармейскую масу. Важнейшая форма сувязі рабочых з чырвонай казармай—шэфства.

Пагэтаму перад тварам нарастаючай ваеннай небясьпекі адным з вуалавых лёзунгаў павінна быць узмацненьне рабочага шэфства над Чырвонай арміяй. Становішча шэфства вельмі нас непакоіць: яно шмат дзе адзначаецца казённымі бюракратычнымі хваробамі, мае шэраг буйных недахопаў. Неабходна пільная ўвага савецкай грамадзкасьці да гэтага важнейшага вучастку сацыялістычнай абароны. Нярэдка шэфства праводзіцца ў апаратным парадку бяз удзелу шырокіх пластоў працоўных. У габінэтах пагоджваюцца і ўвязваюцца пытаньні толькі адносна грашовай дапамогі падшэфнай частцы. Кіраўнікі прадпрыёмстваў або ўстаноў наведваюць час ад часу «даручаныя ім падшэфныя часьці» і гэтым абмяжоўваюцца. Шэфская праца вядзецца ад адной юбілейнай гадавіны да другой. Тады, здараецца, апроч шэфскіх «правадыроў» у чырвонаармейскія часьці на ўрачыстыя пасяджэньні і вечары прыходзяць і працоўныя. Чырвонаармейцы наведваюць клюбы сваіх шэфаў. Завязваецца сувязь, чуюцца гутаркі аб непарушнасьці шэфства, абяцаньні «наладзіць і паглыбіць" шэфскую працу і разыходзяцца да... наступнага сьвята.

Ці-ж гэта ня [illegible] запраўдным рабочым шэфствам? [illegible] дзіўнага, што чырвонаармейцы просяць забраць ад іх бязьдзейнічаючых шэфаў. Байцы справядліва скардзяцца: «У дні ўрачыстасьцяй нас хваляць,—а ў буднія дні вучобы, руплівай упартай працы ў сьценах чырвонай казармы працоўныя заўважваць байца не прывычаены». Гэту мертвячыну, бюракратычны склероз у рабочым шэфстве над Чырвонай арміяй неабходна асудзіць і рашуча ўзяць курс на сапраўднае масавае рабочае шэфства.

Паміж рабочымі і чырвонаармейцамі патрэбна ўзаемная інфармацыя. Шэфам неабходна бліжэй падысьці да патрэб байцоў, наладзіць таварыскую сувязь. У разьмеркаваньні матар'яльнай дапамогі падшэфнай часьці павінны прыняць удзел і рабочыя. Яны павінны ведаць, на якія патрэбы і колькі выдана сродкаў. Культурнае і палітычнае супрацоўніцтва рабочых з падшэфнымі часьцямі вельмі кепскае. А між тым супольная праца ў розных вайсковых і грамадзкіх гурткох і школах магчыма вельмі неабходна. Дзьверы рабочых клюбаў павінны быць гасьцінна і шырока расчынены для чырвонаармейцаў-падшэфнікаў, чаго да гэтага часу няма.

На саюзы працаўнікоў мастацтва і працаўнікоў асьветы ўскладзена ганаровая роля—культурнага шэфства над Чырвонай арміяй. Ня гледзячы на вялікія посьпехі, і яно мае немалыя недахопы. Культурныя і грамадзкія запыты байцоў узрастаюць і вымагаюць ад культшэфаў больш кваліфікаванага культурнага абслугоўваньня, больш прадуманай і плянавай працы.

Зроблены агляд чырвонай казармы быў праверкаю шэфства над Чырвонай арміяй. Ён паказаў дасканалыя ўзоры братэрскай сувязі і дапамогі чырвонай казарме. Але ён-жа ўскрыў мертвячыну, казённшчыну і вялікія правалы ў рабочым шэфстве.

Чырвоная армія ня толькі баявая школа адважных байцоў за Саветы, але і кузьня барацьбітоў, будаўнікоў новага сацыялістычнага жыцьця. Ёй увага, ёй клопаты, ёй братэрская дапамога і цеснае супрацоўніцтва рабочых фабрык і заводаў! Узмацнім рабочае шэфства на Чырвонай рабоча-сялянскай арміяй!

Н. Л.

ЭТАПЫ РАЗЬВІЦЬЦЯ КАМІНТЭРНУ.*)

(Артыкул тав. Д. Пятроўскага).

Капіталістычная стабілізацыя і барацьба з апартунізмам.

Ажыцьцяўленьне прынцыпаў бальшавізацыі пасьля V кангрэсу сустрэлае новыя перашкоды, абумоўленыя, у першую чаргу, ходам разьвіцьця капіталістычнай стабілізацыі, якая, у сваю чаргу, узмацняе рэфармізм і паціск рэфармізму на найбольш слабыя зьвяньні камуністычных партый у розных краінах. Спрэчкі аб капіталістычнай стабілізацыі, аб яе характары вырашаны ў праграме, прынятай аднагалосна на VI кангрэсе Камуністычнага Інтэрнацыяналу: «Вопыт усяго пасьляваеннага гістарычнага разьвіцьця паказвае, што дасягнутая шляхам расправы над рабочай клясай і сыстэматычнага націску на яго жыцьцёвы ўзровень стабілізацыя капіталізму ня можа ня быць частковай, часовой, гнілой».

Пытаньне аб капіталістычнай стабілізацыі ўжо даўно стаяла ў парадку дня Камуністычнага Інтэрнацыяналу. Сьцішаны тэмп разьвіцьця рэвалюцыі ўжо выяўляўся на III кангрэсе Камінтэрну. Не выпадкова Ленін у сваёй прамове на III кангрэсе (аб тактыцы УсеКП(б) двойчы падкрэсьліваў той факт, што сапраўды рух адбываўся ня так проста-лінейна, як мы гэтага спадзяваліся. У рэзалюцыі III кангрэсу адзначана магчымасьць, што за сучасным крызісам у большай ці меншай колькасьці краін наступіць паласа ўздыму. Але ўжо III кангрэс падкрэсьлівае, што «гэты ўздым ніяк ня будзе азначаць пачатак арганічнай эпохі». Значна пазьней (у сакавіку 1926 г.) VI пленум Камінтэрну перасьцерагаў ад няправільнага разуменьня, а галоўнае, ад пераацэнкі сэнсу і значэньня капіталістычнай стабілізацыі, падкрэсьліваючы, што «перыяд заняпаду капіталізму працягваецца».

Мы наўрад ці памылімся, калі скажам, што ўхілы ад правільнае лініі ў перыяд паміж V і VI кангрэсамі былі больш усяго зьвязаны з пераацэнкаю трываласьці капіталістычнай стабілізацыі.

Хваравіты працэс капіталістычнай стабілізацыі даў у выніку радыкальную зьмену функцый сацыял-дэмакратыі. Новая функцыя сацыял-дэмакратыі адзначана ў цэлым шэрагу пастаноў пленумаў і кангрэсаў Камуністычнага Інтэрнацыяналу. Ужо V кангрэс Камінтэрну зазначаў на тое, што ў Эўропе сацыял-дэмакратыя ў поўным сэнсе становіцца трэцяю партыяй буржуазеі. Той-жа кангрэс адзначыў, што фашызм і сацыял-дэмакратыя ўрэшце зьяўляюцца аднолькаваю зброяю пануючых клясаў супроць рэвалюцыйнага пралетарыяту.

Больш падробязны аналіз новае ролі і новае функцыі сацыял-дэмакратыі быў дадзен IX пленумам (люты 1928 г.), які і намеціў дырэктыву ўзмацненьня барацьбы супроць імпэрыялізму разгорнутым наступам супроць сацыял-рэфармізму ва ўсіх яго разнастойных выглядах і, у першую чаргу, супроць так званай «левай» сацыял-дэмакратыі. Іменна ў сувязі з аналізам новай функцыі сацыял-рэфармізму IX пленум і намеціў агульную новую тактычную лінію для ўсіх камуністычных партый у прафсаюзах і спэцыяльна сфармуляваў тактычныя дырэктывы (агульныя) для ангельскай і францускай камуністычных партый.

Тыя, хто схілен пераўвялічваць ролю капіталістычнай стабілізацыі, не заўважвае таксама тае новае функцыі, якую сацыял-дэмакратыя выконвае ў сучасную эпоху.

Пераацэнка капіталістычнай стабілізацыі цесна і непасрэдна зьвязана з недаацэнкаю тэй здрадніцкай і штрэйкбрэхерскай ролі, якую сацыял-дэмакратыя зараз адыгрывае ў справе капіталістычнай рацыяналізацыі і падрыхтоўкі новых войнаў. Асабліва энэргічнымі і адкрытымі абаронцамі сацыял-дэмакратыі і Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу выступаюць брандлерысты.

Новая тактыка, начарна намечаная IX пленумам выканкому Камінтэрну і шырока разгорнутая VI кангрэсам, зводзіцца да таго, каб узмацніць самастойную ролю камуністычных партый ва ўсіх сфэрах клясавай барацьбы і, у першую чаргу, унутры прафсаюзнага руху, у справе падрыхтоўкі і кіраўніцтва насьпяваючымі бойкамі. Ва ўсёй Эўропе мы назіраем зараз узмацненьне актыўнасьці рабочае клясы, спробы пераходу да актыўнай абароны супроць капіталістычнага наступу, а часамі і да наступу ў мэтах палепшаньня свайго становішча. Усе гэтыя спробы сустракаюць супраціўленьне ўсіх апаратаў капіталістаў і буржуазнай дзяржавы і ў першую чаргу, мэтадычную штрэйкбрэхерскую работу рэфармісцкага лідэрства ў прафсаюзах. Натуральна, што справа арганізацыі боек рабочых, справа кіраўніцтва гэтымі бойкамі зьяўляецца найважнейшай задачай камуністычных партый. Усякая спроба ўхіліцца ад гэтых задач спрыяе рэфармістам, г. зн. дапамагае капіталу ажыцьцяўляць рацыяналізацыю за кошт пагоршаньня дабрабыту рабочае клясы. Новая тактыка ў галіне палітычнай зводзіцца да больш вострай барацьбы супроць сацыял-рэфармізму (у Англіі—рашучы наступ супроць рабочай партыі буржуазеі, у Францыі—выступленьне супроць усіх буржуазных партый, уключаючы сацыялістычную партыю, і г. д.) Гэта новая тактыка выклік

НАПЯРЭДАДНІ ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ.

Вясеньняя сяўба пад пагрозай зрыву.

Загатоўка насеньня розных культур праходзіць дрэнна.—Складаюць пляны, даюць дырэктывы, а ніхто не правярае, як яны выконваюцца на мясцох.—Бюракратызм, валаніта і спрэчкі ў цэнтральных установах і арганізацыях.

Пад кіраўніцтвам тав. Лазоўскага група інспэктароў НК РСІ Беларусі правяла ў цэнтральных установах абсьледваньне становішча падрыхтоўкі да вясеньняй пасеўнай кампаніі.

Вынікі абсьледваньня былі абгаворваны на аб'яднаным пасяджэньні Прэзыдыуму ЦКК, ЦК КП(б)Б і калегіі НК РСІ ў прысутнасьці прадстаўнікоў усіх установаў, маючых дачыненьне да пасеўнай кампаніі.

Аб чым-жа сьведчаць вынікі абсьледваньня?

Кепска стаіць справа з загатоўкай насеньня розных культур. Так, плян загатоўкі канюшыны недавыкананы на 83 проц., вікі—на 83,2 проц., лубіну—на 92 проц., сэрадэлі—на 64 проц. і ячменю—на 30 проц. Мясцовыя загатоўкі на 10 лютага стаяць зусім дрэнна, асабліва загатоўкі канюшыны, вікі і сэрадэлі,—пляны па гэтых культурах выкананы ў сярэднім ня больш, як на 15 проц.

Зусім катастрафічна стаіць справа са зборам закантрактаванага насеньня па асобных культурах, выкананьне пляну даходзіць аж да 3 проц. Апрача недысцыпліванасьці сялянства, тут вінавата і тое, што на збор закантрактаванага насеньня ня была зьвернута ўвага.

Белсельтрэст і Белдзяржсьпірт ня толькі ня выканалі дырэктыў аб своечасовай расплаце з насельніцтвам, але нават і дагэтуль не заплацілі сялянству за здадзеныя ім культуры.

Белсельтрэст, Белсельсаюз і іх мясцовыя арганізацыі ня выконваюць пастановы Савнаркому аб абмене сялянству яго насеньня на палепшанае. Белсельсаюз да 1 лютага ня выканаў дырэктыў СНК аб прыёма аўса і прымаць яго адмаўляецца.

ДЫРЭКТЫВЫ АБ АЧЫСТЦЫ 50 ПРОЦ. НАСЕНЬНЯ ЎЖО НЕЛЬГА ВЫКАНАЦЬ.

Зусім дрэнна на мясцох праходзіць ачыстка насеньня: да 15 лютага ачышчана толькі 13 проц. Нагрузка машын месцамі дасягае толькі 6 пр. Калі зараз усе машыны нагрузіць поўнасьцю на 100 проц., дык і то дырэктывы ўраду нельга будзе выканаць, бо ачыстка вельмі позна пачалася.

У цэнтральных установах няма ніякіх вестак аб ходзе ачысткі насеньня лёну. Не хапае трыераў і сарціровак. Наркамзем мала зрабіў для папаўнываньня гэтай кампаніі.

Супэрфасфатам пасеўная кампанія забясьпечана на 43 проц., па іншых відах штучнага ўгнаеньня ёсьць абяцаньні даставіць усё, але хімсындыкат сваё абяцаньне выконвае вельмі кепска.

Цікава адзначыць, што неразьбярыха з забясьпечаньнем штучнымі ўгнаеньнямі і дайшла да таго, што ўсё атрыманае накіравана на прыватны сэктар, а аграмаджаны... ішчэ пасьпее...

ПРА ЗАПАСНЫЯ ЧАСТКІ ДЛЯ МАШЫН ЗАБЫЛІ...

З забясьпечаньнем да сяўбы сельска-гаспадарчымі машынамі пагрозы няма, але...

Эканонарада і НК РСІ далі ВСНГ Беларусі цьвёрдую дырэктыву накладаецца аб вырабу акучнікаў. Між тым ВСНГБ вісне на выконвае гэтых дырэктыў.

[illegible] таго, што ў ліку Наркам[illegible] не прадугледжана забясьпечаньне сялянства запаснымі часткамі для розных машын. Белсельсаюз таксама не падумаў аб гэтым і не зрабіў заяўкі Наркамзем. А Нар. Кам. Гандлю і мэталётрэст сваёй ініцыятывы ў гэтым пытаньні не праявілі. Урэшце, у лютым Белсельсаюз дадумаўся, што сялянству патрэбны будуць запасныя часткі, і даў на іх заяўкі.

Для рамонту с.-гасп. інвэнтару патрэбна жалеза: Белсельсаюз даў заяўку на 12 вагонаў, а атрымаў толькі 1. Ні Нар. Кам. Гандлю, ні Белсельсаюз ня ведаюць, якая забясьпечанасьць жалезам, а так... на вока...

Толькі цякуючы газэтам нашы гаспадарнікі ў канцы лютага зрабілі заказ на 5 вагонаў жалеза для вырабу лемяхоў і адвалаў.

ЗАМЕСТ 60 РАМОНТНЫХ МАЙСТЭРНЯЎ—НІВОДНАЙ.

У пастанове Савнаркому прадугледжана па ўсёй БССР арганізаваць 60 майстэрняў для рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару, але дагэтуль ніводнай майстэрні не арганізавана.

Белсельтрэст гэтую важную пастанову выканаў у габінэтным парадку і бюракратычна.

Зразумела, пры такім парадку разьмеркаваньня сродкаў грошы папалі ў тыя савгасы, якія майстэрні ўжо маюць, і замест арганізацыі новых майстэрняў сродкі ў лепшым выпадку пойдуць на рамонт існуючых.

АМАТАРЫ ПАПЯРОВАЙ ВАЛАНІТЫ...

аказваецца, працуюць у Наркамгандлі. Саюзны Нар. Кам. Гандлю даслаў нашым наркамгандляўцам абежнік з указаньнем парадку выдачы ліцэнзій на імпартныя машыны і абсталяваньне.

Не спадабалася нейкаму чынушы, што абежнік напісаны ня зусім чытальна, і вось паляцела ў Маскву паперка з просьбай дасланць гэты абежнік лепш надрукаваным.

Чакалі, чакалі, а з Масквы яго ня шлюць, і праз 5 хыдняў, «нальчиком водя», усё-ж прачыталі і ня чытальны. Адным словам, валаніту з выдачай ліцэнзій цягнулі з 29 верасьня да 26 лістапада. А шкада, бо можна было-б дацягнуць і да чэрвеня—у Наркамгандлі БССР часам гэта здараецца...

Плян новай кантрактацыі быў зацьверджан у пачатку студзеня, а зацьвердзіць разьмеркаваньне сродкаў камісія Наркамгандлю сабралася толькі... 7 лютага.

Падрыхтоўчая праца да правядзеньня кантрактацыі праведзена арганізацыямі вельмі нездавальняюча: дагэтуль ішчэ ня ўсе блянкі дагавораў дасланы на месцы, а некаторыя ішчэ... друкуюцца.

Плян фінансаваньня кантрактацыі забясьпечаны сродкамі на 85 проц.—ёсьць звыш 5.000.000 руб. Гэтыя сродкі раз'асягнаваны на 80 проц., а рэшта не разьмеркавана, таму што Наркамзем, Наркамгандлю і іншыя арганізацыі не далі плянаў па некаторых мерапрыёмствах.

МАХІНАЦЫІ БЕЛСЕЛЬТРЭСТУ І ДОЎГІЯ СПРЭЧКІ БЕЛСЕЛЬСАЮЗУ...

Для крэдытаваньня савгасаў у пасяўную кампанію адпушчаны Белсельтрэсту адпаведныя сродкі.

Здаецца, гропы павінны пайсьці таму, каму яны прызначаны, а на справе...

Белсельтраст з гэтых сродкаў разьлічваецца з запазычанасьцю Белсельбанку; адным словам, замест пасеўнай кампаніі звыш 100.000 руб. ідуць на пакрыцьцё старых пазык, якія павінен Белсельтрэст аддаць Белсельбанку, а той пра гэта ведае і... нічога...

Спрэчкі паміж Белсельсаюзам і Белдзяржбанкам цягнуцца без канца. Пазы дзярэцца, а ў хлопцаў чубы трашчаць, бо пізоўка дагэтуль гэтых грошай не атрымала.

«КАЗЕННОЕ БЛАГОПОЛУЧИЕ» У КАЛГАССАЮЗЕ...

Праца па калектывізацыі праходзіць досыць павольным тэмпам: плян пакуль што выкананы на 25 проц.,—трэба арганізаваць па БССР 360 новых калгасаў, а арганізавана толькі 91.

Плян па правядзеньню пасеўнай кампаніі Белкалгассаюз склаў, але калі яго пачнеце праглядаць, дык ён не забясьпечвае ўсіх мерапрыёмстваў, якія трэба правесьці.

— З насеньнем, угнаеньнем і машынамі,—кажуць у Белкалгассаюзе,—вялікай пагрозы няма. Між тым ёсьць небясьпека, што нашы калгасы ў гэтай галіне застануцца ні пры чым.

Савгасамі нічога ня зроблена па збору попелу. Ды што попел, калі Белсельтрэст, відаць, мала цікавіцца і тым, што ачыстка насеньня сялянству ў савгасах праходзіць вельмі слаба. Між тым на долю савгасаў прыпадае ачысьціць 1500000 пудоў насеньня.

АЎСЯНАЯ ГІСТОРЫЯ НАРКАМЗЕМУ.

У свой час «Сельгаснаводны Саюз» запрапанаваў Белсельсаюзу даставіць 23.000 цэнт. шацілаўскага аўса. Белсельсаюз у Наркамзем—ці можна гэты аўёс загатовіць?

Наркамзем адказвае, што ня раіць завозіць, бо ён для беларускіх умоў не падыходзіць. Калі жадаеце, дык бярыце адказнасьць на сябе...

Белсельсаюз на сваю рызыку закупіў 23.000 цэнт. Пачынаюць прыходзіць вагоны: гледзяць—усхожасьць шацілаўскага аўса хістаецца ад 96 да 98 проц.

Праз некаторы час НКЗем дае ўжо распараджэньне загатаўляць аўёс з усхожасьцю 60 проц.

Наогул, завозным аўсом БССР забясьпечвалі на ўсе 100 проц., але мы адмаўляліся яго браць. Падобная да шацілаўскай гісторыя з аўсом «Гігант»—адмаўляліся браць, а пасьля праверкі аказалася, што ён вельмі добры на ўсхожасьць і яго завозяць.

ТАВ. КАЛНІН, ДАЗВОЛЬЦЕ СПРАЎКУ...

Дакладчык скончыў. Скончыліся сумныя лічбы, факты галавацяпства, недарэчнасьцей, бюракратычнага падыходу да вельмі важнай справы. Прадстаўнікі ведамстваў і арганізацый, вінаватыя ў пагрозе зрыву пасеўнай кампаніі, зварачваюцца да НК РСІ тав. Калініна аб дазволе даць спраўкі. Зразумела, усе зваляваюць віну на аб'ектыўныя ўмовы, тым больш, што іх заўсёды лежачы можна знайсьці.

Прадстаўнік Белсельсаюзу дае спраўку, супэрфасфат папаў у прыватны сэктар таму, што яны набывалі яго асобна для аношняга і асобна для савгасаў і калгасаў.

Дык вось першая частка атрымалася і папала па прызначэньню. Другую частку супэрфасфату яны, магчыма, і не атрымаюць. Мы пераразьмяркуем, і савгасы не застануцца без угнаеньня. А ў якую капеечку ўляціць гэта пераразьмеркаваньне, Белсельсаюз не сказаў.

— Мы,—кажа прадстаўнік Белсельсаюзу,—адмовіліся толькі ад прыёму насеньня лёну. Праўда, ад савгасаў аўёс ішчэ ня ўзялі, але дырэктывы ўжо на месца далі.

Скардзіцца Белсельсаюз, што яны ніякіх вестак з месц аб прыёме ня маюць.

Дзяржбанк нас арадытуе на суму каля 10.000.000 руб. і з іх каля 1500000 руб.—на кантрактацыю. Сума буйная, і мы непакоімся, ці зможам яе сабраць, а таму і не даём гарантыі Дзяржбанку.

ЦІ АДКАЗВАЙЦЕ, ЦІ АДМОЎЦЕСЯ АД КІРАЎНІЦТВА НІЗОЎКАЙ.

Прадстаўнік Беларускай Канторы Дзяржбанку знаходзіць, што калі Белсельсаюз адмаўляецца даць гарантыю, значыць, кантрактацыя будзе праведзена дрэнна, і Белсельсаюз не спадзяецца сабраць пазыку.

— Дзяржбанк будзе сурова высякаць пазыкі. Ня трэба займацца сабатажам. Белсельсаюз павінен адказваць за працу пізоўкі, або з яго трэба зьняць кіраўніцтва апошняй.

МЭТАЛЁТРЭСТУ ПАТРЭБЕН НОВЫ ЗАВОД ДЛЯ РАМОНТУ... 1—2 ТРАКТАРЫ.

Прадстаўнік мэталётрэсту дае спраўку, што яны ня могуць вырабляць акучнікі, бо няма інструмэнтаў. У нас ёсьць 10.000 акучнікаў, мы іх запрапанавалі беларускім арганізацыям куніц, але, аказваецца, нашы акучнікі не падыходзяць для ўмоў БССР і ляжаць бяз толку. Запасныя часткі для с-гасп. машын, калі будзе жалеза, зробім, а калі не, дык застанецца сялянства без запасных частак.

— Была пастанова, каб мы рамонтавалі трактары. Мы што-ж, мы не адмаўляемся, але для гэтага трэба арганізаваць новы спэцыяльны цэх.

З МЕСЯЦЫ ШУКАЕМ. ХТО ЗАЦЬВЕРДЗІЦЬ ПРАЭКТ.

Эканонарада дала ўказаньне пабудаваць у калгасе імя Вароўскага (Барысаўскі раён) крахмальны завод.

Склалі праэкт заводу, ідзём у Белсельбанк,—кажа прадстаўнік Белкалгассаюзу,—за грашыма, а там іх не даюць, пакуль ня будзе зацьверджаны праэкт.

Тры месяцы вандруем з установы ў установу з просьбай разглядзіць і зацьвердзіць праэкт.

— Рэспубліканскі інжынэр кажа, што ён разглядае праэкты коштам звыш 200.000 руб,

ВСНГБ кажа, што будаўніцтва калгасаў яго не датычыцца. У акрыпляне таксама адмаўляюцца. Гэтак цягнемся з праэктам ужо 3 месяцы.

ЗАМЕСТ РЭГУЛЯВАНЬНЯ ЗАЙМАЕМСЯ АРБІТРАЖАМ.

Нам. Наркамгандлю тав. Абрамсон кажа, што паміж установамі і арганізацыямі па кожнаму дробнаму пытаньню ідуць сваркі. Арганізацыі ніяк ня могуць паміж сабой дагаварыцца, нават з-за бульбы і то прыходзілася Наркамгандлю судзіць, быць арбітражам.

Спрэчкі, валаніта, вечная «междоусобица» і сварка паміж ведамствамі не даюць магчымасьці працаваць, толькі і займаешся, што мірыш установы і арганізацыі.

Што робіцца з падрыхтоўкай да сяўбы, ніхто—ні Нар. Кам. Гандлю, ні НКЗем, ні Белсельсаюз, ні іншыя арганізацыі нічога ня ведаюць.

ЗАМЕСТ ЖЫВОЙ СПРАВЫ—ПЛЯНЫ І СПРАВАЗДАЧЫ.

— Група сельскай гаспадаркі Наркамзему, кажа нам. НКЗ тав. Адамовіч,—замест жывой аператыўнай працы, на працягу ўсяго часу занята плянаваньнем і складаньнем справаздач.

Савнарком і Дзяржплян засынаюць нас патрабаваньнямі розных плянаў. За 6 месяцаў,—кажа тав. Адамовіч,—я ні разу ня бачыў, каб інспэктары групы займаліся непасрэднай аператыўнай працай. Я прыходзіў у НК РСІ, гаварыў аб неабходнасьці зьнішчыць гэту ненармальнасьць, але ўсё ішло так, як і было.

Трэба ачысьціць 6.000.000 пуд. насеньня, а ачышчана толькі 1000000 пуд. Райвыканкомы ня цікавяцца пытаньнем сельскай гаспадаркі. У Бабруйшчыне, Гомельшчыне і ў некаторых іншых округах пачалі рамантаваць машыны толькі [illegible] з кастрычніка павінны [illegible] чысьціць насеньне.

ПРАЦАВАЦЬ, ЯК У БАЯВЫХ АБСТАВІНАХ.

Народны Камісар РСІ БССР тав. Калнін гаворыць, што мы майстры складаць добрыя пляны, прыгожыя рэзалюцыі, але дагэтуль не навучыліся правяраць, як яны выконваюцца, як ажыцьцяўляюцца на мясцох.

Лепш мець адну дырэктыву ды выканаць яе добра, чым сем і ўсе іх выконваць дрэнна.

Слабое разгортваньне падрыхтоўчай працы да правядзеньня сяўбы на мясцох спрабуюць зваліць на тое, што перашкаджала кампанія перавыбараў саветаў. Аб гэтым гаворыць на мясцох пагаварваюць дзе-ні-дзе і ў цэнтральных установах і арганізацыях, якія павінны несьці адказнасьць за правядзеньне пасеўнай кампаніі.

Між тым дырэктывы былі такія, што перавыбары саветаў павінны былі праходзіць пад лёзунгам узьняцьця гаспадаркі. А раз гэта так, дык пытаньні пасеўнай кампаніі ў часе перавыбараў саветаў павінны былі займаць адно з галоўных месц.

Што зроблена прысутнымі прадстаўнікамі ведамстваў і арганізацый, каб трыер, што ляжыць пад сьнегам адрамантаваць і павезьці яго з вёскі ў вёску для ачысткі насеньня?

На гэта пытаньне вы даеце адзін адказ—што ў вас вестак няма.

Трэба прывучыць сваю сыстэму і пэрыфэрыю даваць весткі своечасова. Як-жа інакш вы кіруеце работай, будуеце свае пляны, калі ня ведаеце, што робіцца на мясцох?

Мы бачым, што цэнтральныя ўстановы і арганізацыі не змаглі дысцыплінаваць свой пішаны апарат, а гэта нікуды ня варта. Асноўная недарэчнасьць ў падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі зьяўляецца тое, што вы на здолелі прымусіць свой апарат на мясцох працаваць так, як у часе вайны.

Нам трэба паглядзець у 2 акрывыкан комах і некалькіх райвыканкомах, што яны там робяць в пасеўнай кампаніі. Можна ішчэ шмат нагнаць, шмат зрабіць пры агульнай увазе да пытаньня праверні працы на мясцох, каб выправіць усе недарэчнасьці, каб правесьці здавальняючa пасеўную кампанію.

Нам трэба вывіць канкрэтных насіцеляў зла і прыцягнуць іх да суровай адказнасьці. Угнаеньне папала ў першую чаргу ў прыватны сэктар—гэта вам ня жарты; значыць, нехта ў апараце спрабуе сарваць усю нашу палітыку, сарваць выкананьне дырэктыў партыі і ўраду. За гэта трэба біць і моцна біць.

Ці наш ВСНГБ не заклікан да таго, каб арганізаваць прадпрыёмствы для абслугоўваньня сельскай гаспадаркі? Ці ён ня мог праявіць у гэтым напрамку сваю ініцыятыву? Ці ВСНГ ня ведаў, што ў БССР прывозяцца трактары і іншыя складаныя машыны, каб падумаць, дзе іх з часам рамантаваць?

Трактару ў нас ня могуць адрамантаваць, а аўтамабілі і маторныя лодкі рамантавалі. У нас ня сотні, а адзінкі трактараў, якім патрабен рамонт, і іх можна рамантаваць без пабудовы спэцыяльных новых цэхаў.

Як справа з запаснымі часткамі?

Бачыце, калі жалеза і сталь атрымаюць, дык тады нам абяцаюць нарабіць запасных частак для с.-г. машын. А чаму вытворчасьць іх не прадугледжана ў вытворчым пляне трэсту?

Чаму толькі пасьля артыкулаў у газэтах пачалі клапаціцца аб сталі для запасных частак? А дзе-ж нашы гаспадарнікі былі раней, чым і аб чым яны думалі да студзеня месяца?

Асноўная наша бяда ў тым, што мы ніяк ня можам дагаварыцца. Калі зьядуцца дзьве ўстановы, дык абавязкова патрэбна трэцяя, каб іх памірыць.

Раней гарадавы гаварыў—„ідзем у вучастак, там разьбярэмся". А зараз у нас гаворыць—ідзем у РСІ—нас там разьбяруць. З гэтымі поглядамі і ідэямі трэба весьці рашучую барацьбу.

Час ішчэ ёсьць. Трэба ўсе апараты, якія маюць дачыненьне да пасеўнай кампаніі, перастроіць так, каб яны працавалі гібка, дакладна, як вайсковыя часьці ў баявых абставінах. В. З.

Нарада кіраўнікоў савецкіх гаспадарак.

Справаздача Белсельтрэсту.

(Даклад т. Хрысанфава).

СЛАБЫ ПАДБОР КІРАЎНІКОЎ САВГАСАЎ.—НАБЫВАЮЦЦА СТАЕННЫЯ КОНІ, А КУЗЬНІ НЯМА.—САВГАСЫ СЛАБА РЫХТУЮЦЦА ДА СЯЎБЫ

Вялікай перашкодай у галіне разьвіцьця савгасаў зьяўляецца слабы падбор кіраўнікоў савгасаў. З 160 кіраўнікоў 92 маюць ніжэйшую адукацыю.

Апроч гэтага, заўважаецца вялікая цякучасьць кіраўнікоў. За апошні час звольнена 42 кіраўнікі, 30 кіраўнікоў прыцягваюцца да судовай адказнасьці. У адной толькі Віцебскай акрузе з 11 кіраўнікоў савгасаў 9 звольнена ў працягу апошняга году. Гэта сьведчыць аб разлажэньні, аб адсутнасьці цьвёрдай дысцыпліны сярод верхавіны савгасаў.

У сучасны момант нашы савгасы маюць 83 проц. рабочага складу і 17 проц. служачых. Апошняя лічба зьяўляецца надзвычайна вялікай. Ёсьць такія выпадкі, калі на стада нароў у 22 галавы трымаюць спэцыяльнага жывёлавода.

Дакладчык прадэманстраваў цэлы шэраг агідных фактаў злоўжываньня з боку кіраўнікоў савгасаў.

У савгасе Купцічы кіраўнік трымаў 60 курэй, 6 сьвіней, 4 сабак. За адзін лістапад гэты кіраўнік умудрыўся выпісаць 17 галовак сыру. У дадатак да ўсяго гэтага ён растраціў 900 руб.

У савгасе Уваравічы кіраўнік парассоўваў каля 10.000 руб. Ёсьць злоўжываньні з камандыроўкамі. Тры разы перарабляўся бровар, каб даць зарабіць сваім людзям. У гэтым савгасе 11 рабочых маюць сваю жывёлу; нягледзячы на гэта, яны атрымалі кампэнсацыю за ліквідацыю жывёлы. У гэтым высковым савгасе трымалі 2-х фурманоў: адзін вазіў кіраўніка, а другі яго памоцніка.

У савгасе Весялова п'яны кладаўшчык паехаў катацца на заводзкой кабыле і пакалечыў яе.

У некаторых савгасах пускаліся на аўнае ашуканства. Напрыклад, куплялі самыя звычайныя каровы, але толькі чырвонай масьці, а ў рахунках паказвалі іх гатунковымі і адпаведна гэтаму набаўлялі па іх цану.

У адным савгасе кіраўнік набыў у Ленінградзе за вялікія грошы стаеннага каня і мыкоены вазок, але затое ў гэтым савгасе няма добра абсталяванай кузьні.

Такіх фактаў, нажаль, шмат і яны сьведчаць аб тым, што сярод служачых савгасаў ёсьць паўныя кадры саботажа, разбэшчанага элемэнту, такая распуста магла мець месца в прычыны слабага кантролю з боку трэсту і слабага разгортваньня самакрытыкі з боку рабочых савгасаў.

Дакладчык прыводзіць шэраг фактаў дрэннага выкарыстоўваньня с.-г. прыладаў і нядбайных, часам нават і барбарскіх адносін да жывёлы. У некаторых савгасах узараць трактарам 1 гэкт. пахаты абыходзіцца ў 19 руб., у той час, калі пры нармальных умовах гэта павінна каштаваць ня больш 6 руб. Тлумачыцца гэта тым, што трактары працуюць з слабай нагрузкай.

У некаторых савгасах с.-г. машыны і прылады складаюцца ў адну вялікую кучу, дзе яны ня толькі не захоўваюцца, але наадварот, псуюцца. Плугі і бароны ў гразі, пяску, іржавеюць пад адкрытым небам.

Што павінны зрабіць савгасы ў галіне падрыхтоўкі да сяўбы?

Трэба памятаць, што савгасы маюць сёлета заданьне павысіць ураджайнасьць на 17,2 проц. Пакуль што ў некаторых нашых савгасах ураджайнасьць знаходзіцца на адноль кавым узроўні з сялянскімі палеткамі.

Савгасы ўсё топчуцца на ўраджаі ў 60 пуд. з гэктара. Далей такія ўраджаі зьяўляюцца непарпімымі. Трэба рубам паставіць задачу аб падняцьці ўраджайнасьці. Ня гледзячы на ўсе дырэктывы, савгасы позна разгарнулі зерноачышчэньне, а калі гэта кампанія распачалася, дык у некаторых савгасах кіраўнікі абмежаваліся высылкай абоваў. Гэтага мала. Трэба, каб кіраўнікі пільна сачылі за справай зерноачышчэньня і дапамагалі ўсямернаму ўцягванню ў гэту справу шырокіх колаў сялянства.

Таксама слаба адгукнуліся савгасы на заклік зьбіраньня попелу. Некаторыя кіраўнікі ўсё чакалі ад Белсельтрэсту адпаведных дырэктывы, а сваёй ініцыятывы не праяўлялі. Тут назіраюцца нейкія бюракратычныя адносіны, нейкая абломаўшчына. Напрыклад, у савгасе Стара-Сельцы сабралі каля 2,5 пуд. попелу і на гэтым спыніліся.

Савгасы Белсельтрэсту маюць усе падставы для свайго разьвіцьця. На 1 студзеня 1929 г. усе савгасы трэсту маюць розных вямлі да 95000 гэкт., з якой 38700 гэкт. пахаці, 31260 гэкт. сенажацяў, 1700 гэкт. садоў. Далейшае пашырэньне пахаці можна праводзіць за кошт распрацоўкі хмызьнякоў, мэліараваных балот і скараченьня сядзіб.

Гужавой сілай савгасы забясьпечаны здавальняюча—ёсьць 3676 коняў і мае паступіць у паступным сэзоне 78 трактараў.

У далейшым трэба зьвярнуць увагу на папаўненьне савгасаў каровамі, бо ў сучасны момант гэтыя гаспадаркі маюць толькі 17 проц. колькасьці таго быдла, якое яны маглі-б утрымліваць. Ад гэтага залежыць павялічэньне агульнага балянсу натуральнага гною, з чым цесна зьвязана павялічэньне ураджайнасьці.

Вёска бярэцца за вырашэньне пытаньняў ураджайнасьці і калектывізацыі.

(Ліст з Магілеву).

Ураджайная хваля дакацілася ўжо непасрэдна да вёсак.

Вось што вырашылі (практычна вырашылі!) сялянскія вёскі Блудзімлі, Брацькавіцкага сельсавету.

Але спачатку—пра сход. На сходзе ўдзельнічалі гаспадары і гаспадыні бадай-што на 100 процантаў. Сход прайшоў з вялікай зацікаўленасьцю і зацягнуўся за поўнач.

Прыняты пастановы наступнага зьместу:

— Цалкам ачысьціць насеньне.

— У папарных палёх адвесьці клін для засеву вікі.

— У яровым полі на аўсу падсеяць канюшыну.

— На спробу кожнаму гаспадару забараніваць кавалак жыта.

Пасьля самі сяляне ўзьнялі пытаньне аб калектывізацыі.

Быў усебакова абгаворан калгасны статут, тутака беднота і частка сераднякоў умоўліваюцца складсьці калгас, пупчаецца сьпіс, пад якім падпісаліся 13 дваро ў (у вёсцы ўсяго 23 двары).

Прыблізна гэтыя-ж самыя пастановы прыняты ў ваколіцы Блудзімлі (і тамака каля паловы двароў згадзіліся складсьці калгас), у Дуброўцы і іншых вёсках.

Па Брацькаўскім сельсавеце абгаварэньне пытаньняў ураджайнасьці і севу адбываецца на вясковых сходах

Час ужо іншым сельсаветам і райёнам скончыць «папярэдняе» абгаварэньне на пленумах і сельсаветах і выйсьці ў вёску. КВІК.

ЯК ПОЛАЧЧЫНА РЫХТУЕЦЦА ДА ВЯСНЫ.

Зараз галоўная ўвага камуністычнай партыі і савецкай улады зьвернута на паляпшэньне сельскай гаспадаркі, на калектывізацыю і перабудову вёскі, на падвышэньне ўраджайнасьці нашых палёў, што нічыльна зьвязана з пабудовай новага—сацыялістычнага жыцьця.

Парэнныя, грамадзкія, гаспадарчыя, савецкія і камсамольскія арганізацыі Полаччыны добра ўяўляюць гэтыя задачы і дырэктывы. Мы адзначым, як гэтыя дырэктывы прыстасоўваюцца да мясцовага жыцьця і асабліва як ідзе падрыхтоўка да веснавой пасеўнай кампаніі.

Праведзеная праверка ударнымі групамі АКК-РСІ сьведчыць аб наступным.

АКРСЕЛЬСАЮЗ ЯНЯ ЎСЁ ЗРАБІЎ.

Мы ведаем, што ад здавальненьня насельніцтва сельска-гаспадарчымі машынамі залежыць пасьпяховая падрыхтоўка да вясны, залежыць добрая апрацоўка зямлі, і адсюль—павышэньне ўраджайнасьці.

На плянку акрсельсаюзаў у падрыхтоўчы перыяд павінна быць завезена 8164 плугі. Але на 25 лютага прывезена толькі 4664 плугі, якія разьмеркаваны наступным чынам: Полацкаму раёну—75 плугоў, Ветрынскаму—41, Вульскаму—43, Вушацкаму—56, Лепельскаму—74, Расонскаму—51, Дрысенскаму—39, Асьвейскаму—35, Валынецкаму—67 плугоў і г. д.

Справа з загатоўкай іншых сельска-гаспадарчых машын абстаіць крыху лепш: меркавалася завезьці 866 пружынных бароп, а ўжо ёсьць 630; меркавалася завезьці 48 культіватараў—ёсьць 41; меркавалася атрымаць па пляну 29 сартыровак, а ёсьць 63; трактары пакуль што не дастаўлены (мае быць завезена 10 шт.).

З загатоўкай насеньня справа абстаіць надта дрэнна.

Нашы кааператыўныя арганізацыі слаба праводзяць загатоўку, з прычыны чаго ня хопіць сельска-гаспадарчага насеньня.

Па пляну павінна быць завезена 117 тон канюшыны, а ёсьць толькі 16 тон, замест 549 тон вікі завезена 16 тон, цімафейкі меркавалася завезьці 30 тон—ёсьць 10,5, тамасплак, касьцяная мука, калійная соль і чылійская сялітра ішчэ «едуць», і невядома, калі прыедуць.

АРГАНІЗУЕМ НОВЫЯ КАЛЕКТЫЎНЫЯ ГАСПАДАРКІ.

На калектыўнае сельска-гаспадарчае будаўніцтва зварачваецца асаблівая ўвага. У сучасны момант на Полаччыне ёсьць 90 калгасаў. Апрача гэтага ў чарговую пасеўкампанію намечана арганізаваць ішчэ 31 калгас, а за ўвесь год—46 калгасаў.

На сёнешні дзень афарміена арганізацыя 10 калгасаў у наступных раёнах: у Ветрынскім—2, Полацкім—1, Асьвейскім—2, Вульскім—4 і Валынецкім—1.

Насеньнем і ўгнаеньнямі калгасы будуць здавальняцца ў першую чаргу. Меркуецца завезьці 1316 цэнтнэраў аўса, 49 ц. ішаніцы, 390—ячменю, 105—гароху, 5296—бульбы, 320—лёну, 103—канюшыны, 6,5 сэрадэлі, 596—вікі, 251—лубіну і 5 цэнтнэраў цімафейкі.

Большасьць гэтага насеньня ўжо завезена.

Апрача гэтага, меркуецца завезьці 1721 цэнтнэр супэрфасфату, 832—калійнай солі, 40—серна-кіслага амонія, 150—тамасплаку, 15—сялітры і 30 цэнтнэраў гіпсу.

Сіламі калгасных аб'яднаньняў намечана і будзе праведзена ў жыцьцё вялікая работа на дапамозе беднаце, кантрактацыі, насеннаводству і інш.

АКРУГОВЫ КАМІТЭТ УЗАЕМАДАПАМОГІ СЬПІЦЬ.

На камітэты ўзаемадапамогі ўскладаецца вялізная работа па дапамозе беднаце пры правядзеньні працы па падвышэньні ўраджайнасьці, калектывізацыі і перабудовы вёскі.

Але Полацкі акруговы камітэт узаемадапамогі ішчэ, мусіць, не ўявіў вялікай важнасьці пасеўкампаніі, з прычыны гэтага ён нічога ня робіць у гэтым кірунку.

Як гэта ні дзіўна, а акруговага пляну на правядзеньне кампаніі па КСУ няма. Замест гэтага ёсьць ведамасьць ЦК КСУ, дзе намечана некалькі мерапрыёмстваў, але іх выкананьня пры такім становішчы чакаць цяжка.

Намечана ачысьціць па акрузе 69000 пудоў насеньня. Але вестак аб ачысьцы няма. Меркавалася каапераваць 1130 бядняцкіх гаспадарак, а колькі кааперавана, невядома.

Меркуецца пабудаваць у раёнах 4 кузьні для рамонту сельска-гаспадарчых машын (Асьвея, Валынцы, Расоны і Полацак); фактычна-ж кузьні будуюцца толькі ў двух раёнах, а ў астатніх раёнах, за адсутнасьцю сродкаў, кузьні ня будуюцца і невядома ці будуць яны да вясны пабудаваны. Тое-ж самае заўважаецца і з арганізацыяй сельска-гаспадарчых калектываў.

Акруговы камітэт узаемадапамогі ставіць важную палітычную кампанію пад пагрозу зрыву. Бюракратычнае тлумачэньне ўпаўнаважанага ЦК КСУ тав. Куплайса кажа нам аб тым, што камітэты ўзаемадапамогі могуць кампанію праваліць.

На гэты фронт неабходна зараз-жа мабілізаваць увесь вясковы актыў, каб сіламі апошняга ўзварухнуць камітэты ўзаемадапамогі.

ПРА НЯЎДАЛЫЯ І „ФАНТАСТЫЧНЫЯ" ПЛЯНЫ.

Акруговы плян агранамічных мерапрыёмстваў на вясеньню і асеньню пасеўкампаніі быў складзены 10 лістапада, а 20 лістапада быў разасланы па раёнах.

Раёны на падставе пляну Акрэа павінны былі даць свае пляны, але некаторыя з іх гэтага ішчэ не зрабілі (Полацак, Валынцы).

Неабходна адзначыць, што некаторыя пляны складзены вельмі няўдала. Вось прыклады.

Плян Расонскага РВК па свайму зьместу агульны: не паказвае, дзе будуць арганізаваны калгасы, дзе будзе праводзіцца шматпольле. Пагэтаму пляну павялічэньне сэрадэлі прадугледжваецца на 13 гэктараў, тады як ва ўмовах Расонскага раёну сэрадэля мае вялізарнае значэньне.

Аб пратручваньні насеньня Расонскі РВК напісаў так: «Прымая пад увагу, што нават нагрузка мінулага году ў 5 тон на аграадзінку па пратручваньню насеньня ня была выкананa, дадзеную Акрэа нагрузку ў 20 тон трэба прызнаць фантастычнай і заставіць нагрузку мінулага году ў 5 тон.»

Бачыце, па-расонску выходзіць так, што калі у мінулым годзе нагрузка ня была выкананa, альбо, калі нічога ня зроблена, дык з вопыту мінулага году нічога ня трэба рабіць, трэба ня выконваць заданьні Акрэа.

Плян Дрысенскага РВК таксама мала адрозьніваецца ад расонскага. Там мае месца «сухая белетрыстыка», агульныя пункты, накшталт „неабходна, трэба, наладзіць, палепшыць" і г. д. У галіне пераводу на шматпольле запісана: «працу па пераводу на шматпольле пачаць зараз-жа, выяўляючы сяленьні і пасёлкі, дзе будуць завадзіцца шматпольныя севазвароты».

Падобна-ж складзены і пляны іншых райвыканкомаў. Некаторыя проста перапісалі плян Акрэа з надпісам—«па нашаму раёну».

Галоўнае—райвыканкомы ішчэ ня ўсе даслалі свае пляны у Акрэа, а некаторыя дасланыя пляны ляжаць без належных заўваг з боку Акруговага Зямельнага Аддзелу.

АКРЭА ЗАЙМАЕЦЦА ЦЕГАНІНАЙ.

Падрыхтоўчая работа да пасеўнай кампаніі ў Акрэа распачата своечасова: былі дасланы пляны і ўказаньні на раёны, зроблен спэцыяльны абгляд 8 раёнаў па пытаньню аб падрыхтоўчай рабоце да сяўбы, была праведзена акруговая нарада па падвышэньню ўраджайнасьці, а таксама ўсе райграномы ўдзельнічалі ва Ўсебеларускім агранамічным зьезьдзе.

Усё гэта добра. Але ў Акрэа ёсьць вялікія недахопы: на акрузе заўважаецца вялізарнае імкненьне да арганізацыі арцеляў. Ня гледзячы на пастанову сэсіі ЦВК аб перадачы райвыканкомам правоў на канчатковае зацьверджаньне і рэгістрацыю арцеляў. Акрэа да гэтага часу прымушае рэгістраваць упоў арганізаваныя арцелі

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

аб складзе акруговых і раённых выканаўчых камітэтаў і іх прэзыдыумаў.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР пастанаўляе:

1. Устанавіць склад акруговых выканаўчых камітэтаў у ліку ня болей 55 членаў і 15 кандыдатаў да іх і склад прэзыдыумаў Акруговых Выканаўчых Камітэтаў у ліку ня болей 11 членаў.

2. Склад раённых выканаўчых камітэтаў раённаў, у якіх маюцца гарады, устанавіць у ліку 30 членаў і 9 кандыдатаў да іх. Склад раённых выканаўчых камітэтаў астатніх раённаў устанавіць у ліку 25 членаў і 7 кандыдатаў да іх.

Склад прэзыдыумаў раённых выканаўчых камітэтаў устанавіць у ліку 7 членаў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

2 сакавіка 1929 г., г. Менск.

Постановление

Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР

о составе окружных и районных исполнительных комитетов и их президиумов.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР постановляет:

1. Установить состав окружных исполнительных комитетов в числе не более 55 членов и 15 кандидатов к ним и состав президиумов Окружных Исполнительных Комитетов в числе не более 11 членов.

2. Состав районных исполнительных комитетов, районов в которых имеются города, установить в числе 30 членов и 9 кандидатов к ним. Состав районных исполнительных комитетов остальных районов установить в число 25 членов и 7 кандидатов к ним.

Состав президиумов районных исполнительных комитетов установить в числе 7 членов.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

2-го марта 1929 года. г. Минск.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР

аб падпарадкаваньні Слуцкага, Рэчыцкага і Клімавіцкага гарадзкіх саветаў адпаведным раённым выканаўчым камітэтам.

У адпаведнасьці з арт. 29 „Асноўных Палажэньняў аб арганізацыі ў Саюзе ССР гарадзкіх саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў" (Збор З. СССР за 1928 г. № 10, арт. 86) і арт. 12 „Палажэньня аб гарадзкіх саветах БССР" (Збор З. БССР за 1928 г. № 38, арт. 262). Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР пастанаўляе:

1. Слуцкі, Рэчыцкі і Клімавіцкі гарадзкія саветы падпарадкаваць адпаведным раённым выканаўчым камітэтам.

2. Гэтую пастанову ўключыць у справаздачу Ураду Беларускае ССР IX-му Усебеларускаму Зьезду Саветаў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

2-га сакавіка 1929 году, г. Менск.

Постановление

Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР

о подчинении Слуцкого, Речицкого и Климовичского городских советов соответствующим районным исполнительным комитетам.

В соответствии со ст. 29 „Основных Положений об организации в Союзе ССР городских советов рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов" (Собран. Зак. СССР за 1928 г. № 10, ст. 86) и ст. 12 «Положения о городских советах БССР» (Собран. Зак. БССР за 1928 г. № 38 ст. 262), Президиум Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР постановляет:

1. Слуцкий, Речицкий и Климовичский городские советы подчинить соответствующим районным исполнительным комитетам.

2. Настоящее постановление включить в отчет Правительства Белорусской ССР IX-му Всебелорусскому С'езду Советов.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

2 марта 1929 г. г. Минск.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР

аб дапаўненьні арт. 18 Палажэньня аб гарадзкіх саветах новым абзацам.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР пастанаўляе:

Дапоўніць арт. 18 Палажэньня аб гарадзкіх саветах (Збор З. БССР за 1928 г. № 38, арт. 362) наступным абзацам, запісаўшы яго пасьля 1-га абзацу:

„У буйных гарадох з дазволу Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР апроч камунальнага аддзелу могуць утварацца і іншыя аддзелы гарадзкога савету".

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

2-га сакавіка 1929 г. г. Менск.

Постановление

Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР

о дополнении ст. 18 Положения о городских советах новым абзацем.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР постановляет:

Дополнить ст. 18 Положения о городских советах (Собр. Уз. БССР за 1928 г. № 38, ст. 362) следующим абзацем, записав его после 1-го абзаца:

«В крупных городах с разрешения Президиума Центрального Исполнительного Комитета БССР кроме коммунального отдела могут организовываться и другие отделы городского совета».

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

2-го марта 1929 г. г. Минск.

У ЭКАНАМІЧНАЙ НАРАДЗЕ БССР.

ПРА АБ'ЯДНАНЬНЕ ПРАДПРЫЁМСТВАЎ ЦЭГЛЯНАЙ, КАХЛЯНАЙ І ВАПНА-КРЭЙДАВАЙ ВЫТВОРЧАСЬЦІ Ў БССР.

Дзеля ўпарадкаваньня вырабу і разьмеркаваньня будаўнічых матар'ялаў, а таксама пашырэньня іх вытворчасьці і забясьпячэньня імі будаўніцтва—Экана лічыць неабходным арганізацыю трэсту аб'яднаных прадпрыёмстваў, цэглянай, кахлянай і вапна-крэйдавай вытворчасьці рэспубліканскага значэньня з падпарадкаваньнем іх ВСНГ БССР.

Усе прадпрыёмствы, падлягаючыя аб'яднаньню трэстам да моманту яго арганізацыі, застаюцца ў Белдзяржбудзе.

Для ўзбуйненьня і ўмацненьня існуючых прадпрыёмстваў, на згодзе з акрыкамкомамі, ЭКАНА лічыць магчымым далучэньне да гэтага трэсту і больш буйных прадпрыёмстваў мясцовага значэньня, для чаго даручана ВСНГ БССР увайсьці ў перагаворы з АВК.

АБ ПРАДАСТАЎЛЕНЬНІ ТРЭСТУ «ЛЕСАХІМ» ЯСНЫХ ХВАЁВЫХ ПЛОШЧАЎ ДЛЯ ПАДСОЧКІ.

Лесахімічная вытворчасьць з кожным годам набывае ўсё большае і большае значэньне. Для разьвіцьця лесахімічнай прамысловасьці і пашырэньня яе вытворчасьці Эканамічная Нарада пастанавіла прадаставіць трэсту «Лесахім» у 1929 годзе площчу для падсочкі ў разьмерах 5.000 гэктараў з уключэньнем і той площчы, якая яму была раней адведзена. Адначасна з гэтым прадстаўнік Лесахіму зрабіў заяву аб тым, што трэстам у бягучым годзе будзе арганізавана падсочка на ўсёй адведзенай яму площчы 5.000 гэктараў.

Каб не затрымліваць падрыхтоўчай працы Лесахіму, зьвязанай з своечасовым пачаткам падсочкі, Экана абавязала НК Земляробства і Лесахім на працягу тыдня заключыць дагавор аб адводзе лясной площчы, вызначэньні ў ім раённых працы Лесахіму, а таксама тэхнічныя ўмовы падсочкі і іншыя моманты, якія зьвязаны з вытвараньнем гэтай апэрацыі, адначасова абавязаўшы НК Земляробства ўзмацніць нагляд за правільным і дакладным выкананьнем Лесахімам дагавору.

ПРА РАЗЬВІЦЬЦЁ МАХОРАСЕЯНЬНЯ І МАГЧЫМАЙ КАНТРАКТАЦЫІ СЫРАВІНЫ.

Каб мець магчымасьць забясьпечыць снабжэньнем махорачую прамысловасьць сыравінай, ЭКАНА лічыць неабходным на сродкі прамысловасьці арганізаваць у 1928-1929 годзе пасеў—тытуню-махоркі, адначасова ўстанавіўшы площчу для кантрактацыі гэтай сыравіны ў 1928-1929 годзе ў 150 гэктараў. Н. К. Земляробства і Н. К. Гандлю даручана ўстанавіць зарадак і ўмовы кантрактацыі.

10 год існаваньня рабфакаў.

Мяцеліца, сыпле сьнег, а па вуліцах ідуць роўнымі шэрагамі з чырвонымі сьцягамі дэманстранты. Яны вышлі вітаць сваё сьвята—10-годзьдзе існаваньня рабфакаў, студэнцкі дзень.

А вечарамі па клюбах, па навучальных установах адбываліся вечары.

Рабфак—сёньня юбіляр. Тэатр перапоўнен рабфакаўцамі, гасьцямі.

Урачыстае пасяджэньне адчынае дэкан Менскага рабфаку т. Лойка.

У прэзыдыум запрашаюцца прадстаўнікі ад ураду, навучальных устаноў, рабочых арганізацый.

Тав. Лойка спыняецца на тых цяжкасьцях, якія прыходзілася перажываць пры заснаваньні рабфакаў наогул і ў прыватнасьці Менскага. 570 менскіх рабфакаўцаў вучыцца ў вышэйшых навучальных установах, пралетарызуючы іх.

— Зараз маем толькі ў Менску тры рабфакі: дзённы, вячэрні і завочны, у якіх навучаецца звыш 1000 чалавек. Расьце сетка рабфакаў. Зерне, кінутае т. Пакроўскім і Крупскай 10 год таму назад, дало багаты плён.

Ад ураду БССР выступіў з прамоваю старшыня СНК т. Галадзед.

— У цяжкія часы быў заснаваны рабфак, у часы, калі прыходзілася трымаць у адной руцэ стрэльбу, а ў другой кнігу. Толькі пралетарскі гарт здолеў вытрымаць усё, перамагчы. Мне, як студэнту Горацкага рабфаку, добра памятна, як цяжка прыходзілася забіраць высоты навукі.

Камуністычная партыя і сав. улада ўдзяляюць шмат увагі пралетарскаму студэнцтву, а таму і мы ўсе павінны быць за адзінства супроць цяжкасьцяў у нашым сацыялістычным будаўніцтве.

Тав. Славінскі вітае ад акружкому КП(б)Б.

— У гэты час, калі за 120 вёрст ад нас адбываецца працэс Бел. Сял.-Раб. Грамады, арышты вучняў бел. гімназіі, мы сьвяткуем тут сваё ўрачыстае сьвята.

— Рабочы факультэт зможа ўзяць камандныя высоты,—кажа тав. Баліцкі—ён заменіць нам старых спэцыялістых. Мы яму аддаём галоўную увагу. Ён зьяўляецца кузьняй пралетарскай ідэалёгіі, дзе апрацоўваецца сыры матар'ял, які ў большасьці прыходзіць з вёскі. Пралетарскае студэнцтва дае і павінна даваць адпор розным ухілам.

— 11 ліпеня 1921 г. быў заснаваны сав. уладай наш Беларускі Унівэрсытэт. Шмат было цяжкасьцяў, пакуль выбіліся на лепшы шлях. Ня было кадраў пралетарскага студэнцтва ў унівэрсытэце і толькі рабфакаўскія выпускі ўзмацнілі іх. Праз рабфакі мы будзем мець сваіх навуковых спэцыялістаў з рабочых і сялян,—кажа ректар БДУ т. Пічэта.

Пад гучныя воплескі Менскаму рабфаку надаецца імя т. Пакроўскага, а Горацкаму—імя т. Галадзеда.

Тав. Галадзед абіраецца ганаровым рабфакаўцам Менскага рабфаку.

С. Б. і А. П.

ЯК ПРАЦУЮЦЬ СЭКЦЫІ РСІ ПРЫ САВЕТАХ.

(Па матар'ялах НК РСІ Беларусі).

ЗА АПОШНІ ГОД ЁСЬЦЬ ЗНАЧНЫЯ ДАСЯГНЕНЬНІ Ў ПРАЦЫ СЭКЦЫЙ. — ЯШЧЭ БОЛЬШ УЗМАЦНІЦЬ СУВЯЗЬ З МАСАМІ, ПРАЦЯГВАЦЬ РАШУЧА БАРАЦЬБУ З БЮРАКРАТЫЗМАМ, ЗА АЧЫШЧЭНЬНЕ САВЕЦКАГА АПАРАТУ АД ЧУЖОГА ЭЛЕМЭНТУ — ВОСЬ ЧАРГОВЫЯ, ВАЖНЕЙШЫЯ ЗАДАЧЫ СЭКЦЫЙ РСІ.

Сэкцыі РСІ пры саветах вылучаюцца адной з найбольш важных форм удзелу рабочых мас у барацьбе з бюракратызмам і праверцы работы сав. і гаспадарчога апарату.

Сэкцыі пры гарадзкіх саветах складаюцца, апрача членаў і кандыдатаў гарсавету (ад 20 да 40 чал.) яшчэ з прымацаваных рабочых-актывістаў, дэлегатак Жанаддзелу і камсамольцаў.

У рабоце ўсіх сэкцый РСІ значнае месца займае правядзеньне сіламі пасобных членаў сэкцый рассьледаваньняў па пісьмовых скаргах і газэтных заметках, што зьяўляецца адной з дадатных форм уцягненьня членаў сэкцый у практычную работу гарсаветаў.

З плянавых абсьледаваньняў, якія право зіліся сэкцыямі ў справаздачным годзе супольна з КК-РСІ, трэба ўказаць на абсьледаваньне прадпрыёмстваў трэсту камунальнага абслугоўваньня, становішча апарату акрстатбюро, беспрацоўе сярод жанчын (Менск), работы органаў па барацьбе з бяспрытульнасьцю; абсьледаваньне дзіцячых ясьляў і садоў (Менск, Магілеў); абсьледаваньне 20 проц. выніжэньня выдаткаў, працоўнай дысцыпліны ў савецкіх установах (праводзілася ў некалькіх акруговых гарадох—Менск, Гомель, Бабруйск, Ворша і інш.); абсьледаваньні гарадзкой Страхкасы, ЦРК, крамных камісій, жылбудаўніцтва, прац калектываў, (Магілеў, Ворша); праверка разьмяшчэньня на працу дэмабілізаваных чырвонаармейцаў (Мазыр); праверана работа 14 кансультацый па абязьпеньню юрыдычнай дапамогі насельніцтву, снабжэньне дрывамі рабочых, служачых і прам. прадпрыёмстваў; праведзена выяўленьне запазычанасьці ў установах і прадпрыёмствах, абсьледаваны больніцы і амбуляторыі (Віцебск). Акрамя таго, сэкцыя ў Магілеве практыкавала даклады гаспадарнікаў і кіраўнікоў устаноў на пленумах сэкцыі.

Неабходна асабліва застанавіцца на дзейнасьці сэкцыі РСІ Бабруйскага гарсавету, якая ў аглядзе сэкцый гарсавету, што зараз праводзіцца, адзначаецца як адна з лепшых. За час сваёй працы гэта сэкцыя зрабіла ўсебаковую праверку 40 устаноў, абслугоўваючых шырокія масы насельніцтва. У аглядзы ўцягваліся ўсе супрацоўнікі і рабочыя ўстановы ці прадпрыёмствы, дзе рабіўся агляд. Пытаньні і вывады агляду абгаварваліся на вытворчых і эканамічных нарадах. У кожную камісію па агляду ўцягваліся прымацаваныя рабочыя—камсамольцы і дэлегаткі, якія актыўна працавалі разам з членамі сэкцыі. Асабліва актыўна працавалі дэлегаткі, якія выконвалі і самастойныя заданьні. Пры аглядах сэкцыя сустракалася з моментамі бесгаспадарчасьці і пратэкцыянізму, у выніку чаго некаторыя зьняты з працы, некаторыя атрымалі вымовы, а тэзіс спраў перададзена пракурору. Сэкцыя правярала выкананьне пастаноў, якое паказала, што амаль усе пастановы яе ажыцьцёўлены.

Сэкцыя таксама дасьледавала звыш 200 паступіўшых да яе скаргаў і газэтных заметак, прычым адказы на скаргі даваліся ў працягу ня больш тыдню. Ва ўсіх клюбах і буйных установах вывешаны скрынкі для скаргаў і прапаноў.

ЦКК-РСІ па дакладу аб працы сэкцыі РСІ ў Менскім гарсавеце адзначыла, як недахопы ў рабоце данай сэкцыі—характэрныя і для іншых сэкцый—наступныя моманты: недастатковасьць колькасьці ўцягнутых у работу сэкцыі рабочых (нячленаў гарсавету) і папулярызацыі яе работы па рабочых сходах, а таксама слабое асьвятленьне работы сэкцыі ў друку; наяўнасьць выпадкаў непраходжаньня пытаньняў сэкцыі праз прэзыдыум гарсавету, што адбіваецца на працы сэкцыі. Сэкцыі РСІ часта не правяраюць выкананьня ў установах іх рашэньняў (Ворша і інш.).

Сэкцыі РСІ арганізаваны таксама і ў гарсаветах неакруговых гарадоў (Рэчыца, Жлобін, Слуцак, Барысаўі і інш.).

За апошнае паўгодзьдзе ва ўсіх акругах пачалі арганізоўвацца **сэкцыі РСІ пры райвыканкомах** і найбольш буйных сельсаветах, дзе забясьпечана кіраўніцтва партячэек. Напрыклад, у сэкцыю пры Бешанковіцкім РВК (Віцебская акруга) увайшло 60 чалавек рабочых, сялян, служачых і саматужнікаў. У плян работы сэкцыі ўключаны абсьледаваньні шэрагу прадпрыёмстваў, устаноў і грамадзкіх арганізацый. Стварэньне сэкцый выклікала вялікую зацікаўленасьць в боку сялянства. Гэткія-ж станоўчыя адносіны з боку сялян да арганізацыі сэкцый РСІ пры РВК і сельсаветах адзначаны і ў некаторых раёнах Менскай акругі.

М. З—ві.

ХРОНІКА.

Тав. Сталін—ганаровы член Гарсавету.

На перавыбарчым сходзе друкароў т. Сталін абраны ганаровым членам Менскага Гарсавету.

Слаба разгарнулася праца

па правядзеньню конкурсу на лепшы савет.

Учора, 4-га сакавіка, адбылося пасяджэньне цэнтральнай камісіі садзейнічаньня правядзеньню конкурсу на лепшы савет.

Тав. Лукашэвіч зрабіў даклад аб тым, як разгарнулася гэта праца па ўсіх акругах.

Кампанія гэта не ва ўсіх акругах распачалася адначасова. У той час, калі ў адных акругах праца па правядзеньню конкурса распачалася ў лістападзе, у некаторых мясцох яна ледзь разгарнулася толькі ў лютым. Асабліва позна разгарнулася гэта кампанія ў Полацкай і Віцебскай акругах. Да 1-га сакавіка конкурсным аглядам ахоплены 84 саветы, што складае 5,6 проц. складу ўсіх саветаў. На першым месцы ў гэтым аглядзе стаіць Менская акруга, на апошнім—Мазырская.

Дакладчык зварачае ўвагу на той факт, што падчас правядзеньня конкурсу мала зварачалася ўвагі на працу камісій сельсаветаў і сэкцый гарсаветаў. Да гэтага часу агледжана 26 сэкцый гарсаветаў. На першым месцы па агляду сэкцый займае Бабруйскі гарсавет і сэкцыі неакруговых гарадоў зусім не аглядаюцца.

Дакладчык адзначыў, што толькі адна «Савецкая Беларусь» высьвятляе ход кампаніі конкурсу, рэшта цэнтральных газэт адводзяць ёй мала ўвагі.

Некаторыя акругі вельмі мала вызначылі сродкаў на прэміраваньне, напрыклад, Полацкая акруга вызначыла толькі 50 руб. Да гэтай справы трэба было прыцягнуць шэраг гаспадарных устаноў.

Слаба адгукнуліся на правядзеньне конкурсу некаторыя ведамствы, якія адмежаваліся толькі сухімі абежнікамі.

Па думцы дакладчыка зараз трэба перайсьці да ўсебеларускага конкурснага агляду працы саветаў з іх сэкцыямі і камісіямі, але адначасова трэба таксама праводзіць агляд і тых саветаў, праца ніх да гэтага часу не правярялася.

1.700.000 на камунальнае будаўніцтва.

Праўленьне цэнтральнага камунальнага банку пастанавіла адпусьціць у бягучым гаспадарчым годзе 1700 тысяч рублёў крэдыту на камунальнае будаўніцтва ў БССР.

З агульнай сумы для менскага вадаправоду адпушчана 150000 руб., на каналізацыю ў Менску—750.000 руб. і на будаўніцтва трамваю 450.000 руб.

Апрача таго з агульнай сумы адпушчана на будаўніцтва Гомельскага вадаправоду 150.000 руб., Полацкага—100.000 руб., Бабруйску і Воршы таксама на вадаправод—па 50.000 рублёў.

На карысьць палітзьняволеных жанчын.

Мы, машыністкі ЦП Саюзу б-г. і лясных рабочых, пастанавілі працаваць у Міжнароднае Жаночае Сьвята Увесь рабочы дзень, і заработак, які належыць нам за 2 гадзіны, аддаём на карысьць палітзьняволеных жанчын капіталістычных краін.

Выклікаем машыністак усіх ЦП саюзу.

Хлебазагатоўкі ідуць марудна.

Згодна апошніх вестак Наркамгандлю, па ўсёй БССР за першую дэкаду лютага загатоўлена розных хлебапродуктаў 1921 тона і за другую—2178 тон, а разам за 20 дзён лютага загатоўлена 4091 тоны, што складае 38,4 проц. месячнага пляну.

Дрэнна абстаіць справа ня толькі з загатоўкай непасрэдна ад сялянства (выканана толькі 26,8 проц. месячнага пляну), але нават і па памольнаму збору выканана толькі 44,8 проц. пляну (за люты месяц). Між тым паступленьне памольнага збору абавязкова.

Месцы спрабуюць сваю слабую працу ў галіне хлебазагатовак тлумачыць тым, што перашкаджалі вялікія маразы ў першай дэкадзе і сьнежныя завеі —у другой. Але гэтую прычыну нельга прызнаць асноўнай у перабоі загатоўчай працы, галоўная-ж прычына хаваецца ў слабай рабоце загатоўчага апарату.

Нам здавалася, што якраз гэты перыяд загатоўчы апарат павінен быў скарыстаць для выяўленьня максымуму ініцыятывы, энэргіі і гібкасьці ў сваёй рабоце. Трэба было-б больш выяжджаць у вёскі, праводзіць сярод сялянства растлумачальную працу; у прыватнасьці неабходна было скарыстаць той рух сярод сялянства, калі яно пачало прывозіць хлеб на загатоўчыя пункты чырвонымі абозамі.

Між тым мы бачым як раз адваротнае.

Маразы і завеі перашкодзілі самому загатоўчаму апарату, працаўнікі якога сядзелі на печы і грэліся, не паказваючы носу з-за дзьвярэй свайго пункту.

Паколькі люты месяц зьявіўся няспрыяючым для разгортваньня загатовак, а ў перспэктыве мы маем яшчэ красавік в яго разводзьдзем, настолькі трэба напружыць усе сілы для разгортваньня хлебазагатовак у сакавіку.

СПОРТ.

Канькабежнае спаборніцтва.

У нядзелю, 3 сакавіка, на кантку МБВ чыгункі адбылося конькабежнае спаборніцтва з удзелам канькабежцаў Масквы, Смаленску і Менску. Спаборніцтвы зарганізавала спорт-ст'яднаньне „Дынамо". Вынікі спаборніцтваў—наступныя:

На дыстанцыю 500 мэтраў першым быў т. Кузьмін (Масква)—47,8 сэк. 2) Паўлаў (Масква)—49,8 сэк, і 3) Пятроўскі (Менск) —50,8 сэк.

Дыстанцыя 5000 мэтр: першае месца заняў лепшы канькабежец Беларусі т. Пятроўскі—9 м. 51 сэк. 2) Парфенаў (Смаленск)—10 м. 13,5 сэк. і 3) Барысэвіч (Менск)—10 м. 14,6 сэк.

У цэлым першае месца заняў калектыў Менску. Усяго прымала ўдзел 12 канькабежцаў.

Трэба адзначыць, што гэта пакуль што першыя ў Менску міжнародныя спаборніцтвы па канькабежнаму спорту, якія, вразумела, ужо ўзварухнулі нашых менскіх аматараў канькабежнага спорту. Трэба іх арганізоўваць часьцей.

Я.

Не пабудове ўнівэрсытэцкага гарадка.

Зараз на будаўніцтве ўнівэрсытэцкага гарадка занята штодзень да 150 рабочых. Праводзяцца ўнутраныя работы ў 4 карпусох і рыхтуюцца да спэцыяльных работ. У наступным будаўнічым сэзоне да пачатку навучальнага году мяркуецца скончыць канчаткова пабудову 4 акадэмічных карпусоў і поўнасьцю іх абсталяваць.

Галоўны аўдыторны корпус павінен быць скончан да студзеня 1930 году.

Складаньне праэкту пабудовы клінік ужо скончана, і не пазьней 7 сакавіка будзе канчаткова вырашана пытаньне аб месцы, дзе яны будуць будавацца.

Эскізы праэкту унівэрсытэцкай бібліятэкі НКА ўжо зацьвердзіў і зараз прыступлена да канчатковага выкананьня праэкту.

Пашырэньне заводу „Энэргія".

ВСНГ Бел. рашыў пабудаваць на заводзе „Энэргія" сьлясарна-зборачны цэх. Гэта мерапрыёмства дасьць магчымасьць уцягнуць у прамысловасьць каля 200 новых рабочых. Пабудова цэху (на арыентыровачных меркаваньнях) будзе каштаваць да 250.000 руб.

Аб рабоце ў дзень 11 сакавіка.

Наркампраны БССР вынес настанову аб тым, што дзень 11 сакавіка для прадпрыёмстваў можа быць дням адпачынку наводле пастаноў агульных сходаў рабочых гэтых прадпрыёмстваў з тым, каб замест гэтага дню працаваць у нядзелю 10 сакавіка.

Рабочы дзень 9 і 10 сакавіка ўстанаўліваецца ў 6 гадзін.

Гэта пастанова Наркампрацы не распаўсюджваецца на тыя прадпрыёмствы і ўстановы, у якіх работа ня можа быць спынена па вытворчых прычынах.

Арганізацыя санітарных гурткоў на прадпрыёмствах.

Прэзыдыум ВСНГ Бел. дазволіў пажарна-страхавой групе арганізаваць санітарныя гурткі першай дапамогі на тых прадпрыёмствах, дзе ёсьць фабрычна-завадзкія дружыны. Пытаньне гэта даручана ўстаноўе з ЦК Беларускага таварыства Чырвонага Крыжу.

„Лёгкая кавалерыя"—на пасеўным фронце.

„Лёгкая кавалерыя" менскага камсамолу правяла абсьледаваньне ходу падрыхтоўкі да сяўбы Менскае акругі. Абсьледаваньне праводзілася ў працягу 2-х дзён.

Перасяленьне жыхароў з Вялікай-Сьлепні.

У зьвязку з тым, што на тэрыторыі в. Вялікай-Сьлепні і аўрэйскага насёлку „Камзэтаўка" будзе арганізоўвацца ўсебеларуская с.-г. выстаўка, жыхарства гэтых селітчаў будзе пераселена ў іншае месца.

Зараз праводзіцца ацэнка будынкаў і інш. маемасьці, якая застанецца на месцы. Да 1-га мая ўсе жыхары павінны ўжо пераселіцца.

13.000 кіл. масла для Менску.

У сакавіку МЦРК атрымае 13.000 кіл. масла. Кожнаму пайшчыку будзе выдавацца на 400 гр. масла.

Бібліаграфія.

ДА САНІТАРНА-АСЬВЕТНЫХ ПЫТАНЬНЯЎ.

Бюлетэнь Цэнтральнага Камітэту Беларускага т-ва Чырвонага Крыжу.

Х год БССР. Сьнежань 1928 г. № 8 (стар 55, цана 15 кап.).

Пытаньні санітарнае асьветы зьяўляюцца асабліва актуальнымі ў нашых умовах. Краіна, якая вынесла ўвесь цяжар імпэрыялістычнае вайны, дзьвёх акупацыяў, якая яшчэ і дагэтуль не зьліквідавала цяжкую спадчыну бежанства, ня можа, зразумела, пахваліцца сваім узорным санітарным дабрабытам. Дзейнасьць такое грамадзкае арганізацыі, як Чырвоны Крыж, мае на мэце змагацца з ранейшай цёмрай, забабонамі і брудам жыцьця" (стар. 7), сеяць сапраўдную санітарную асьвету, падвышаць гігіенічны дабрабыт краіны.

Вось ужо чацьверты год, як выходзіць пэрыёдычнае выданьне „Бюлетэнь цэнтральнага камітэту Беларускага Т-ва Чырвонага Крыжу». Шмат карысных гігіенічна-санітарных ведаў дало гэтае выданьне нашай грамадзе. Яно будзіла грамадзкую думку, накіроўваючы яе на пытаньні гігіенічнае культуры быту і санітарнае асьветы. Таму варта ўрэшце зьвярнуць увагу на гэты орган.

Наша пралетарская дзяржава прасоўвае санітарную (як і наогул усякую асьвету) у гушчы працоўных масаў. Таму трэба асабліва вітаць тую папулярнасьць, агульнадаступнасьць, якою адзначаецца часопіс Беларускага Чырвонага Крыжу.

Асабліва цікавым зьяўляецца аддзел допісаў з месцаў. Вось апісаньне таго простага і мэтавгоднага спосабу, якім прычапляецца санітарная асьвета шырокім масам насельніцтва. «Вучыць не загадам, а прыкладам» (учить не приказом, а показом)—залатое правіла, якое заўсёды дае найлепшыя вынікі. Чырвоны Крыж шырока карыстаецца гэтым мэтадам.

Вось гурток першае дапамогі пры чыгуначным клюбе Аршанскага вузла. Як зацікавіць людзей санітарна-асьветнай працай? Як заслужыць іх даверанье? Адзіным спосабам—практычнае дапамогі. „Сямігадовая дзяўчынка аднаго разу парэзала глыбока нагу аб бутэлчанае шкло. Кроў біла струменём. Зьбегнуцца жанчыны пачалі прымяняць свае, далёка не санітарныя мэтады. Апынуўшаяся якраз на месцы здарэньня адна з скончаўшых гурток схапіла кавалак матэрыі, туга перавязала нагу вышэй раны, адначасова тлумачачы, што яна робіць. Спыніўшы кроў і перавязаўшы рану, зрабілі насілкі і ўтрох, трымаючы даверху нагу дзяўчынкі, аднесьлі яе ў прыймовы пакой".

Пасьля гэткіх навочных дэманстрацыяў карысьнасьці санітарнае асьветы ўдала прайшлі і сходы і лекцыі, бо насельніцтва ўсюды і заўсёды больш верыць фактам, чымся словам, і апошнія падмацоўваюцца першымі, на іх угрунтоўваюцца, а не наадварот (Стар. 12 і 13). Вось анатамічна-хэмічны габінет Менскага Акруговага Камітэту Чырвонага Крыжу. У гэтым габінеце адбываюцца заняткі з гурткамі першае дапамогі. Тут ёсьць шмат усялякіх неабходных матар'ялаў і наглядных падручнікаў. (Стар. 14 і 15). Вялікае значэньне ў сэнсе распаўсюджваньня сярод насельніцтва санітарных ведаў мае нашая Чырвоная армія. У Полацку Чырвоны Крыж умела выкарыстаў адпускных чырвонаармейцаў у якасьці санітарна-асьветных агітатараў у глухіх далёкіх вёсках, забясьпечыўшы гэтых чырвоных барацьбітоў адпаведнаю літаратурай. (стар. 14). Энэргічна ўзялася за працу і ячэйка Чырвонага Крыжу пры мэлфаку Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту.

Вельмі важна навучыцца працаваць у ўмовах ваеннага часу. Таму, напрыклад, Бабруйская санітарная дружына прымяняе ўдзел у камсамольскіх манэўрах 8-9 чэрвеня бягучага году (стар. 17). Вялікае паказальнае значэньне меў і ўдзел Чырвонага Крыжу ў паветрана-хэмічнай абароне г. Воршы. Гэта таксама рэпэтыцыя тае пяўхільнае, рашучае барацьбы, якая павінна адбыцца паміж нашаю пралетарскаю краінаю і буржуазнымі дзяржавамі.

Адным Чырвоны Крыж мае і іншыя заданьні. Напрыклад ён арганізуе вытворчыя арцелі, у якіх умовы працы адпавядаюць усім чыста патрабаваньням санітарыі і гігіены. (Ткацкая арцель у вёсцы Лошніца на Барысаўшчыне. Стар. 20). У далучанай да БССР Гомельшчыне наш Чырвоны Крыж праводзіць лекцыі і даклады на мэдычных пытаньнях (Праца Камарынскага раённага камітэту Чырвонага Крыжу. Стар. 21).

Нам Чырвоны Крыж наладзіў кантакт з адпаведнымі арганізацыямі Усяго СССР. (стар. 35) і мае нават сувязь, напрыклад, з Латвіяй (стар. 7, 8 і 9), праўда, не забываючыся, што там трэба ў першую чаргу падтрымаць беларускую найменшасьць.

У афіцыйнай частцы мы знаходзім справаздачу за мінулы год і плян дзейнасьці дзейнасьці (у значнай меры—санітарна-асьветнага зьместу: прапаганда добрых гігіенічных навычак, барацьба супроць алькагалізму, арганізацыя ўзорных чайных —месцаў культурнага адпачынку, паляпшэньне школы модычных сясьцёр ды інш. Стар. 35 і 36).

Каляндарны плян працы мы знаходзім на стар. 47, 48 і 49.

Агульнае ўражаньне ад часопісі прыемнае. Тут можна часам знайсьці поўнае колькасьць матар'ялу для санітарна-асьветных гутарак з вучнямі, асабліва-ж цікава правільная прыцыповая ўстаноўка.

Беларускае таварыства Чырвонага Крыжу. 2-гі ўсебеларускі зьезд Чырвонага Крыжу—5-7 мая 1928 г.

Пратаколы і матар'ялы пад рэдакцыяй М. Барсунова і А. Цьвінеўча (43 стаpанкі). Выданьне Цэнтральнага Камітэту Беларускага Т-ва Чырвонага Крыжу Менск, 1928.

Кніжка выдадзена ў дзьвёх мовах: беларускай і францускай (артыкулы: «Вялікі і чарговыя задачы», „Рэзалюцыі зьезду" дадзены і ў францускім перакладзе).

Паміж чарговымі заданьнямі асабліва важнае значэньне для санітарнае асьветы нашае краіны мае пункт в) пыравая аздаравіцельная работа па разьвіцьці санітарнай культуры на вёсцы (стар. 5).

„Гурткі першай дапамогі—бязумоўна найлепшая форма чырвона-крыжнай масавай працы, бо праз іх лягчэй і кучэй можна прыцягнуць масы, лепш за ўсё пра іх можна ўлажыць у наш быт элемэнты санітарнай граматнасьці, санітарных звычаяў, так патрэбных цёмнай беларускай вёсцы. Гурткі першай дапамогі могуць адыграць на вёсцы роль ячэек па стварэньню новага быту, бо праблема культурнай рэвалюцыі нічыльна ўпіраецца ў вялічэньне санітарнае пяпісьменнасьці і ў санітарнае будаваньне".

У рэзалюцыях зьезду, (п. в) падкрэсьлена канечнасьць павесьці шырокую працу дзеля ўкараненьня санітарнай культуры на вёсцы.

Абодзьве кніжкі ўпрыгожаны шматлікімі добра выкананымі ілюстрацыямі.

Трэба зазначыць на тое, што, на пра жалкі жаль, кніжкі выдаваліся сьпешна.

Беларуская мова не заўсёды добрая. На гэты бок трэба зварачаць асабліваю ўвагу, бо, імкнучыся несьці санітарную асьвету на вёску,—належыць гаварыць з селянінам заўсёды самаю чыстаю і правільнаю родною моваю.

Пытаньні санітарнае асьветы вельмі важныя і адказная тэма. Таму тут павінна ўжывацца дакладная тэрміналёгія. Калі, скажам, расейскаму слову «строительство» адпавядае нашае «будаўніцтва», а слову „созидание" „будаваньне", дык трэба гаварыць і пісаць «санітарнае будаўніцтва», а не «будаваньне» (стар. 6 матар'яльнаў зьезду).

Л. Цьвіткоў.

ВОДГУКІ І АБВЯРЖЭНЬНІ.

ХУЛІГАНАЎ—ДА СУДОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ.

У допісе „Лясьнікі хуліганы", зьмешчаным у № 14 за 18 студзеня г. г., паведамлялася аб хуліганцкіх выхадках лясьнікоў Корвуная. Факты пац